Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларус.

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 14 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 178 (4728) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: Перадавы—Зьнішчальны ўдар па сабатажніках перабудовы транспарту. М. ХВЕДАРОВІЧ—Больш увагі ваенна-абарончай літаратуры (2 стар.), М. А.—Страхавую справу ператварыць у сапраўдны вагар аховы сацыялістычнай уласнасьці (2 стар.). П. БРОЎКА і П. ГЛЕБКА —Дзьве брыгады (3 стар.).

АБ ПЛЯНЕ ЗЯБЛЕВАГА ВОРЫВА НА 1933 г.—пастанова СНК СССР

АБ ПАРАДКУ ЗАСЫПКІ ФОНДАЎ ДЛЯ ПАТРЭБ КАЛГАСАЎ І РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ ЗБОЖЖА ПАМІЖ КАЛГАСЬНІКАМІ ПА ПРАЦАДНЁХ — пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР—(1 стар.).

АБ ПАСЬПЯХОВЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЎБОРКІ АЗІМЫХ І ПЕРАВЫКАНАНЬНІ ЖНІВЕНЬСКАГА ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ВЕТКАЎСКІМ РАЁНАМ — пастанова ЦК КП(б)Б — (1 стар.).

Множыць рады ўдарнікаў уборкі, абмалоту і пастаўкі (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ (4 стар.).

ЗЬНІШЧАЛЬНЫ ЎДАР ПА САБАТАЖНІКАХ ПЕРАБУДОВЫ ТРАНСПАРТУ

Апошні аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваёй рэзалюцыі аб задачах партарганізацыі БССР па правядзеньні ў жыцьцё пастаноў ЦК і СНК СССР аб чыгуначным транспарце, адзначыў, што з боку рабочай масы чыгуначнікаў і большасьці спэцыялістаў гэтыя пастановы былі поўнасьцю ўхвалены, былі спатканы гарачым энтузіязмам, ростам ударніцтва, але «практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК і СНК аб перабудове работы на транспарце сустрэла ва ўсіх чыгуначных раёнах БССР яўны сабатаж і супраціўленьне з боку перараджэнцаў, двурушнікаў і чыноўніцка-бюракратычных элемэнтаў, прычым гэта супраціўленьне ня толькі не атрымала рашучага бальшавіцкага адпору з боку раду партыйных, гаспадарчых і прафэсыянальных кіраўнікоў транспарту (Жлобін), а наадварот, рад фактаў паказвае, што гэтыя работнікі і арганізацыі сталі на шлях гнілога прымірэнцтва да сабатажнікаў і змазваньня фактаў супраціўленьня ў справе ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК і СНК аб чыгуначным транспарце».

Пленум абавязаў усіх кіраўнікоў партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый, усіх членаў і кандыдатаў партыі чыгуначнага транспарту БССР неадкладна поўнасьцю перабудаваць работу ўсіх зьвеньняў транспарту на аснове пастаноў ЦК і СНК. Перабудаваць не фармальна, а па сутнасьці, перабудаваць так, як гэтага патрабуе Цэнтральны Камітэт ленінскай партыі і Савет Народных Камісараў СССР. Аб перабудове работы партыя мяркуе па колькасьці пасяджэньняў, пратаколаў, загадаў і тэлеграм, а па канкрэтных выніках практычнай работы, па вытворчых паказальніках.

Як-жа партыйныя, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі чыгуначнага транспарту БССР рэагавалі на сур'ёзнае абвінавачаньне, якое высунуў пленум, наколькі яны апэрацыйна, з бальшавіцкай рашучасьцю і бязьлітаснасьцю выкрываюць і караюць сабатажнікаў перабудовы, наколькі сапраўды да сягнуты пералом у перабудове?

Фактычны стан спраў пацьвярджае, што патрэбнага пералому далёка яшчэ няма, што ў радзе раёнаў працягваюць квітнець старыя бюракратычныя мэтады работы і кіраўніцтва, прычым рад кіраўнікоў—героі славеснай дэкларацыі яшчэ ў ліпені ўрачыста запэўнялі аб завяршэньні перабудовы пры наяўнасьці цэлага раду прарываў у вытворчай рабоце.

Давялі ўспомніць самасупакойваючыя заявы намесьніка парторга Гомельскага раёну АСТАПЕНКІ і памочніка начальніка Аршанскага раёну тав. ЗАНТОВІЧА аб скончэньні перабудовы работы чыгункі, заявы, якія падпадалі ўжо заспуканай крытыцы «Зьвязды». Гэтым заявам да апошніх дзён ня было дадзена бальшавіцкай ацэнкі з боку мясцовай партыйнай арганізацыі. Гэта сьведчыць аб наяўнасьці фактаў замаскаваньня недахопаў і самасупакаеньня фармальнай перабудовай.

На гэтых фактах яшчэ раз пацьвярджаецца правільнасьць ацэнкі, данай у пастанове ЦК УсеКП(б) аб палітаддзелах на чыгуначным транспарце: «Найбольш сур'ёзная небясьпека заключаецца ў тым, што работнікі чыгуначнага транспарту ў сваёй большасьці не заўважваюць, ня бачаць гэтых трывожных адзнак, а хто бачыць стараецца іх замазаць, ня ўскрыць і піківаваць іх, а замазаць, замаўчаць».

Іменна аб гэтым сьведчыць і зьмешчаны на днях у ЦО нашай партыі «Правде» артыкул «Что скрывается за формальным благополучием» аб рабоце Гомельскага эксплёатацыйнага раёну.

У той час, калі Гомельскі раён мае рад сур'ёзных прарываў у рабоце, калі ў выніку згідна нізкай працыцыпліны ў Гомельскім дэпо толькі за дзьве дэкады ліпеня спалены тры паравозы, за ліпень выплаўлена 40 падшыпнікаў і было 23 аварыі, калі выпадкі зрыву спаранай даходзяць да 35 у дэкаду, а ў выніку нізкай якасьці рамонту расьце паўторнасьць, у гэты момант партарганізатар раёну ПАЛЯКОЎСКІ, яго намесьнік АСТАПЕНКА, начальнік раёну ДЗЯМУСЬКОЎ і намесьнік старшыні райпрафсаюзу ГОЛАД, шляхам «очковтирательства» імкнуцца пераканаць, што работа ідзе ўгору, што перабудова праходзіць з посьпехам.

Гэтыя герої славесна-дэкларацыйных мэтадаў работы зазмест бальшавіцкай барацьбы за выкананьне пастаноў партыі і ўраду аб перабудове, аб узмацненьні важнейшага зьвяна транспарту —вагоннай гаспадаркі—далі туды малацэнных работнікаў. Сыгналы «Зьвязды» аб гэтым (№ 175), як і рад папярэдніх сыгналаў аб фармальнай перабудове і канкрэтных сабатажніках не знайшлі выстарчальнага рэагаваньня з боку мясцовых партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый.

Рад недахопаў ёсьць і ў іншых зьвеньнях чыгуначнага раёну. Абменныя пункты працуюць з рук вон дрэнна, растуць адцэпкі вагонаў ад гарэньня буксаў, ад дрэннага догляду. Змазчыку не аддаецца патрэбнай увагі.

Зусім правільна «Правда» з повазу ўсяго гэтага піша: «Становіцца зусім ясным, што кіраўніцтва раёну па сутнасьці сабатавала пастановы ЦК і СНК як аб паравозе, так і аб вагоне».

Партарганізатар ПАЛЯКОЎСКІ ашукаў бюро гомельскага гаркому КП(б)Б, якое абмяркоўвала пытаньне аб ходзе перабудовы на чыгунцы. Ён зглядзіў вострыя куты, паказаў становішча спраў у ружовых фарбах і ў выніку пытаньне на бюро ГК па сутнасьці было змазана.

Гэта-ж факт, што паппечнікі ўжо вядомага па матар'ялах «Зьвязды» сабатажніка—старшыні гомельскага райпрафсаюзу ГРЫБАНАВА—члены прэзыдыуму АНУФРЫЕЎ і ГОЛАД засталіся не пакаранымі, што сам Грыбанаў, які разам з Ануфрыевым і Голадам разваліў работу, сабатаваў перабудову, да гэтага часу не атрымаў суровага партыйнага пакараньня і адпачывае на курорце. Або ўзяць факты грубага ігнараваньня пастановы ЦК і СНК аб правядзеньні атэстацыі работнікаў транспарту, факты ўраўніловкі ў зарплаце, факты злачынстваў у транспартнай каапэрацыі, фармальнай перабудовы ТСТ у ОРС. Яны былі фактычна абыйдзены, бальшавіцкага рэагаваньня на іх ня было.

Апошні пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б проста запісаў: «Партыя паставіць паза радамі ўсіх тых, хто сваім прымірэнцтвам, гніла-лібэральнымі, мяшчанска-абыватальскімі адносінамі будзе перашкаджаць аздараўленьню транспарту». Гэта пастанова павінна дакладна выконвацца, ня гледзячы на асобы.

Нельга сказаць, што Гомель зьяўляецца выключэньнем. «Зьвязда» ўжо прыводзіла факты простага сабатажу перабудовы і апартуністычнага самасупакаеньня пры адсутнасьці нават зрухаў у паляпшэньні вытворчых паказальнікаў у АРШАНСКІМ, ЖЛОБІНСКІМ і ВІЦЕБСКІМ раёнах.

У ВІЦЕБСКІМ раёне толькі за дзьве дэкады ліпеня было 415 адцэпак ваганаў, шмат зрываў спаранай, паўторнасьць рамонту, пануе ўраўнілаўка ў зарплаце і г. д. Аб чым, як не аб фармальнай перабудове сьведчаць гэтыя факты?

Ці можна ўрэшце чым-небудзь апраўдаць адсутнасьць перабудовы партыйнай работы ў большасьці зьвеньняў Аршанскага раёну? Што-ж можна больш сказаць, калі партарганізатар БАТВА за ўвесь час не палічыў патрэбным нават склікаць партыйны актыў вузла, каб мабілізаваць яго на хутчэйшую рэалізацыю пастаноў СНК і ЦК. Асобныя добрыя прыклады перабудовы не падхоплены, не папулярызаваны і не падтрыманы.

У Аршанскім дэпо партыйная арганізацыя пасьля чысткі сапраўды пабальшавіцку ўзялася за перабудову; правяла расстаноўку партыйных сіл, умацавала нізавыя зьвеньні, разгарнула партыйна-масавую работу і гэта ўжо дала рад паляпшэньню ў вытворчай рабоце. Аднак, уся гэта работа праходзіла бяз удзелу і дапамогі апарату партарганізатара раёну і самога тав. Батвы. Да апошніх дзён Батва ніяк ня мог выбрацца з габінету, каб хаця дапамагчы перанесьці вопыт паравознага дэпо ў вагонкае, дзе прарыў з кожным днём паглыбляецца.

Аршанскі РК КП(б)Б са значным апозьненьнем рэагаваў на дрэнны стан перабудовы ў раёне і за гэта на яго ўспадаецца вялікая віна. Трэба рашуча пакончыць са спробамі тэрытарыяльных партыйных арганізацый (Ворша, Барысаў, Жлобін, Магілеў) самаўхіліцца ад дапамогі і кіраўніцтва перабудовы чыгуначнага транспарту.

Партыя патрабуе актыўнага і сыстаматычнага ўдзелу ў перабудове, у барацьбе за ўздым транспарту ад кожнага камуніста-чыгуначніка, кожнай ячэйкі і кожнага райкому партыі.

Транспарт уступае ў адказны пэрыяд асеньня-зімовых перавозак. Збожжапатокі пачынаюць ужо рушыцца да чыгуначных станцый. Даць здаровы паравоз і вагон—першая і самая важная задача. Жалезная працоўная дысцыпліна, правільная расстаноўка людзей, поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК і СНК і пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб перабудове зарплаты, перагляд норм выпрацоўкі, перабудове рабочага снабжэньня, пастаянныя клопаты аб матар'яльна-бытавым і культурным абслугоўваньні рабочых, выкрыцьцё клясава-варожых элемэнтаў і очышчэньне сваіх радоў ад іх— вось карсткі пералік тых мер, якія трэба неадкладна ажыцьцявіць для забесьпячэньня выразнай работы транспарту і выкананьня пляну перавозак.

Трэба памятаць, што лепшым пацьвярджэньнем перабудовы работы і кіраўніцтва на аснове пастаноў ЦК і СНК будуць служыць штосутачныя вынікі выкананьня плянаў асеньня-зімовых перавозак.

«Справай гонару бальшавікоў транспарту зьяўляецца поўная і хуткая перабудова ўсіх зьвеньняў работы транспарту БССР, выпраўленьне дапушчаных памылак і ўздым работы так, каб транспарт поўнасьцю забясьпечыў шпаркі рост сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі і ўсяго Савецкага Саюзу, эрабіўшы транспарт магутным рухавіком сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны». (З пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Вядучы бязьлітасную барацьбу з апартуністычнымі элемэнтамі, з усякага роду праяўленьнямі сабатажу перабудовы, выкрываючы канкрэтных вінаватых сабатажу, ня гледзячы на асобы, разгортаючы бальшавіцкую самакрытыку, выганяючы канцылярска-бюракратычныя мэтады кіраўніцтва і ўзьмяючы працоўную дысцыпліну, КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК забясьпечыць уздым работы транспарту, рэалізацыю пастаноў ЦК і СНК, бязьвае правядзеньне асеньня-зімовых перавозак.

Чашнікі, райкампарт—Нерадаву, райвыканком—Папку

Праверкай устаноўлен ганебны стан ходу ўборачных работ, абмалоту і збожжаздачы дзяржаве, слабае разгортваньне цераблеьня ільну, поўны зрыў сенаўборкі, адсутнасьць барацьбы з кулацкімі, антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі ў раёне, апартуністычнае хныканьне паасобных кіруючых работнікаў, адсутнасьць рашучай барацьбы з кулацкай антацыяй, якая прыкрывае лодыраў і прагулышчыкаў у калгасах.

ЦК прапануе неадкладна прыняць рашучыя меры для пераключэньня ўсёй партарганізацыі на баявую работу па ўборцы, абмалоту і здачы збожжа дзяржаве калгасамі і адпаасобнікамі, разгортваньні палітычнай, арганізацыйна-масавай работы ў вёсцы. ЦК прапануе жорстка ўдарыць па апартуністычным хныканьні часткі раённага актыву, мабілізуючы масы калгасьнікаў на скончэньне ўборкі збожжавых, цераблеьне ільну, больш шпаркія тэмпы абмалоту і датэрміновую здачу збожжа дзяржаве.

ЦК патрабуе правядзеньня рашучай барацьбы супроць антыдзяржаўных тэндэнцый часткі калгасаў раёну ў справе пастаўкі збожжа дзяржаве, у асабліваści супроць скажэньняў дырэктыў партыі па пытаньнях авансаваньня калгасьнікаў, патрабуе жорсткага рэагаваньня на кожны факт скажэньня.

Аб прынятых мерах паведамеце ЦК да 16 жніўня.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

ВЫШЭЙ ЯКАСЬЦЬ І ТЭМПЫ УБОРКІ, АБМАЛОТУ І ПАСТАВАК

Шырэй фронт барацьбы за месца ў чырвоным рэспубліканскім сьпісу, за ўдзел у Кастрычніцкіх урачыстасьцях у Менску

Аб парадку засыпкі фондаў для патрэб калгасаў і разьмеркаваньні збожжа паміж калгасьнікамі па працаднёх

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

У адпаведнасьці з пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня 1933 году «Аб парадку засыпкі фондаў для патрэб калгасаў і разьмеркаваньні збожжа паміж калгасьнікамі па працаднёх», ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанаўляюць:

1. Абавязаць Наркамзем, РК і РВК пасьля выкананьня калгасамі сваіх гадавых абавязацельстваў па пастаўцы збожжа дзяржаве, здачы збожжа ў парадку натурплаты работ МТС і звароту пазык, прыступіць да ўсіх калгасах да засыпкі насенных фондаў для азімага і яравога пасеву, стварэньня страхавых і насенных фондаў у разьмерах 10 да 15 проц. гадавой патрэбнасьці ў насеньні (у залежнасьці ад ураджаю) і стварэньня фуражных фондаў у разьмерах гадавой патрэбнасьці ў кармох для абагуленай жывёлы.

2. Абавязаць Наркамзем, усе РК і РВК, сельпарт'ячэйкі і сельсаветы не ствараць ніякіх іншых фондаў, акрамя пералічаных вышэй.

Усё збожжа, якое застаецца ў калгасе пасьля выкананьня ім паказаных вышэй абавязацельстваў, стварэньня пералічаных вышэй фондаў, разьмеркаваць поўнасьцю паміж калгасьнікамі па працаднёх.

3. Збожжа паміж калгасьнікамі неабходна разьмяркоўваць па працаднёх, выпрацаваных кожным калгасьнікам з 1 студзеня 1933 году да моманту разьмеркаваньня. Уся колькасьць працадзён, якія калгасьнікі выпрацуюць пасьля разьмеркаваньня ўсяго ўраджаю 1933 году, павінна ўключацца ў суму працадзён, па якіх будзе разьмяркоўвацца ўраджай 1934 году.

4. Абавязаць Наркамзем, усе РК і РВК і палітаддзелы МТС шырока прапрацаваць пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, а таксама гэтую пастанову ва ўсіх калгасах на вытворчых нарадах у брыгадах і на аснове шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва мабілізаваць калгасьнікаў на лепшае і хутчэйшае правядзеньне ўборкі ўраджаю, своечасовае выкананьне абавязацельстваў па здачы прадукцыі дзяржаве і натурплаты МТС і лепшае правядзеньне асеньняй сяўбы.

АБ ПАСЬПЯХОВЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЎБОРКІ АЗІМЫХ І ПЕРАВЫКАНАНЬНІ ЖНІВЕНЬСКАГА ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗДАЧЫ ВЕТКАЎСКІМ РАЁНАМ

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б адзначае пасьпяховае завяршэньне ўборкі азімых і перавыкананьне жнівеньскага пляну па абавязковай здачы збожжавых дзяржаве Веткаўскім раёнам, які павінен быў па пляну здаць 712 тон, а па 12 жніўня здаў 746 тон.

ЦК асабліва адзначае важнасьць такой перамогі раёну ва ўмовах, калі асноўную частку збожжаздачы Веткаўскага раёну выконвае аднаасобны сэктар.

ЦК КП(б)Б заклікае ўсю партыйную, камсамольскую арганізацыю, усіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў Веткаўскага раёну, не трацячы ні адной гадзіны страднае пары, забясьпечыць высокую якасьць уборкі ўсіх яравых пасеваў, не дапускаючы страт, поўнасьцю і датэрмінова выканаць свае абавязкі па загатоўках перад дзяржавай, зматацца за тое, каб быць кандыдатам па прэміяваньне.

ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што бальшавіцкае выкананьне Веткаўскім раёнам жнівеньскага пляну збожжаздачы сьведчыць аб вялізарных магчымасьцях, якія ёсьць для датэрміновага выкананьня абавязкаў перад дзяржавай усімі калгасьнікамі і аднаасобнікамі БССР пры тэй умове, калі гэта забясьпечваецца сапраўды канкрэтнай арганізацыйнай і масава-палітычнай работай і калі на справе вядзецца барацьба супроць апартуністычных, гніла-лібэральных элемэнтаў, супроць кулака і антысавецкіх элемэнтаў.

ЦК КП(б)Б папярэджвае ўсе раёны, што павінна быць рашуча пакончана ў усякімі дэкларацыямі і абяцаньнямі кім-бы яны не даваліся, якія не падмацоўваюцца справай. Трэба на справе, канкрэтна і практычна, правільна арганізаваць, расставіць сілы ў кожным саўгасе, МТС, калгасе і двесці дзворцы для таго, каб забясьпечыць уборку ўраджаю бяз страт і датэрміновую здачу дзяржаве добраякаснага збожжа.

ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе раёны павесьці рашучую барацьбу з тымі элемэнтамі, якія толькі займаюцца разважаньнямі аб добрым ураджаі ў гэтым годзе, самасупакойваюцца, прадастаўляючы справу самацёку і прымаюць мер да рэалізацыі добрага ўраджаю. Такія факты трэба ацэньваць, як простае злачынства перад дзяржавай.

Сураж, сакратару райкампарту

ЦК лічыць недапушчальным такое становішча кіраўніцтва збожжаздачай дзяржаве, калі цэлы рад калгасаў замест першачарговай здачы збожжа дзяржаве праводзіць раздачу збожжа калгасьнікам. Наяўнасьць фактаў антыдзяржаўнага парадку ў калгасах: «Шлях Леніна», імя Будзённага, імя Чарвякова, «Новы сьвет», слабае рэагаваньне на гэтыя факты з вашага боку, сьведчаць аб вашым поўным неразуменьні партыйных задач, аб няўменьні растлумачыць масам калгасьнікаў, працоўным аднаасобнікам пастаноў партыі і ўраду аб збожжаздачы, няздольнасьці стаць на чале барацьбы партарганізацыі і лепшых калгасьнікаў з антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі ў раёне.

ЦК катэгарычна патрабуе неадклад на прыняць рашучыя меры да выпраўленьня грубата парушэньня дырэктыў партыі, пакараньня вінаватых, баявога пераключэньня ўсёй партарганізацыі, калгасьнікаў, працоўных аднаасобнікаў на скончэньне ўборкі збожжавых, баявыя тэмпы абмалоту і датэрміновае выкананьне збожжаздачы дзяржаве. Па сутнасьці закранутых пытаньняў дайце тлумачэньне 16 жніўня.

Шаранговіч.

Мабілізаваць моладзь і дзяцей на ахову ўраджаю і барацьбу са стратамі

УСІМ НАЧАЛЬНІКАМ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ

Ня гледзячы на наяўныя дырэктывы ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б, шматлікія сыгналы з раёнаў гаворацьць аб тым, што барацьба са стратамі і ахова ўраджаю ва многіх калгасах пастаўлены надзвычай нездавальняюча.

Ахова ўраджаю скрозь і ўсюды перадаверана вартаўніком і аб'ездчыкам, якія не заўсёды добрасумленна адносяцца да сваіх абавязкаў.

У справу барацьбы са стратамі (падграбаньне, збор каласоў і г. д.), а таксама аховы ўраджаю на полі, па малатарань, складаў, слаба ўцягнуты перадавыя калгасьнікі, асабліва моладзь і калгасныя дзеці (піянэры).

Створаныя па ініцыятыве камсамолу і перадавых калгасьнікаў дружыны, пасты, дазоры ня сталі масавым рухам, які-б захапіў большасьць калгасьнікаў.

Існуючыя дазоры, пасты, дружыны малалікія, не аформлены, склад кіраўніцтва слабы, неправераны. Кіраўніцтва далёка не адпавядае таму значэньню, якое мае самы рух.

Прапаную: начальнікам палітаддзелаў зараз-жа прыняць усе меры да таго, каб забясьпечыць сапраўднае ўцягненьне перадавых калгасьнікаў і моладзь у ахову ўраджаю.

Неабходна ўсямерна павялічыць коль касьць дружын, пастоў, дазораў па ахове ўраджаю, арганізаваўшы іх у кожнай брыгадзе, выпучыць для кіраўніцтва імі лепшых партыйцаў, камсамольцаў і перадавых калгасьнікаў-ударнікаў. Кіраўніцтвам гэтых пастоў дапамагчы расставіць сілы, добра праінструктаваць іх.

Неабходна скарыстаць вопыт палітаддзелаў Паўночнага Каўказу («Правда» за 8-VIII-1933 г.), арганізаваць з піянэраў неарганізаваных дзяцей у калгасах групы «лёгкай кавалерыі» па збору калосьсяў і ахове ўраджаю. Падабраць для кіраўніцтва атрадамі праверанных кіраўнікоў з ліку камсамольцаў. Аказаць усямерную дапамогу атрадам у справе ўстанаўленьня аб'ектаў і арганізацыі іх работы, усклаўшы арганізацыю і кіраўніцтва ўсёй гэтай справай на пам. нач. палітаддзелу па камсамолу.

Работу перадавікоў неабходна сыстэматычна асьвятляць у друку, усямерна заахвочваючы работу лепшых таварышоў, а таксама цэлыя групы (прэміяваньне).

Нач. палітсэктару МТС НКЗ БССР РАТНЭК.

ПЛЯН СЕНАЗДАЧЫ ПА БССР ВЫКАНАН НА 44,1 ПРОЦ.

НА 10 ЖНІЎНЯ ПА БССР ЗАГАТОЎЛЕНА 44,068 ТОН СЕНА, ШТО СКЛАДАЕ 44,1 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ.

ПА КАЛГАСАХ ГАДАВЫ ПЛЯН ВЫКАНАН НА 121 ПРОЦ., ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ—НА 41,1 ПРОЦ.

КРЫВУЮ СЕНАЗАГАТОВАК ПА РЭСПУБЛІЦЫ ГОНІЦЬ УНІЗ СЫСТЭМА ЛУГТРЭСТУ. ЛУГАВОДНЫЯ САЎГАСЫ ЗДАЛІ УСЯГО 598 ТОН СЕНА, ПРЫ ПЛЯНЕ Ў 27 ТЫС. ТОН, ШТО СКЛАДАЕ 2,2 ПРОЦ. (БЕЛТА).

АБ ПЛЯНЕ ЗЯБЛЕВАГА ВОРЫВА НА 1933 год

Пастанова Савету Народных камісараў Саюзу ССР ад 11 жніўня 1933 г.

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР **пастанаўляе:**

1. Зацьвердзіць плян зяблевага ворыва на 1933 год у разьмеры 36,5 млн. га, з іх:
у саўгасах—6.557,2 тыс. га
у калгасах—27.266,5 тыс. га, у тым ліку
ў калгасах, якія абслугоўваюцца МТС—17.847 тыс. га,
у аднаасобных гаспадарках—2.676,3 тыс. га

2. Устанавіць наступнае разьмеркаваньне зяблевага ворыва па саюзных і аўтаномных рэспубліках, краёх і абласьцях:

(У тыс. га)

РЭСПУБЛІКІ, КРАІ І ВОБЛАСЬЦІ	Усяго па ўсіх сэктарох	У тым ліку: Калгасы	З іх калгасы, якія абсл. МТС	Саўгасы ўсіх сыстэм	З іх: Наркамсаўгасаў	Наркамзему	Наркамснабу	Цэнтрасаюзу	Іншыя саўгасы	Аднаасобнікі
Паўночны край	131,0	100,0	22,0	16,0	5,0	1,4	0,4	4,3	4,9	15,0
Карэльская АССР	32,9	17,1	4,0	2,5	0,5	—	—	0,3	1,7	13,3
Ленінградзкая вобласьць	607,0	380,0	210,0	67,0	6,0	5,3	17,7	14,7	23,3	160,0
Заходняя вобласьць	1214,0	840,0	350,0	74,0	33,0	22,6	7,0	3,1	8,3	300,0
Маскоўская вобласьць	2033,0	1450,0	500,0	258,0	42,0	46,8	103,8	31,7	33,7	325,0
Іванаўская вобласьць	646,0	470,0	230,0	57,0	18,0	14,2	0,6	13,0	11,2	119,0
Горкаўскі край	924,0	730,0	280,0	74,0	17,0	15,0	3,0	11,2	27,8	120,0
ЦЧВ	3519,0	2679,0	1839,0	580,0	267,0	100,0	171,2	21,5	20,3	260,0
Уральская вобласьць	1710,0	1300,0	1000,0	310,0	172,0	39,0	7,0	32,2	59,8	100,0
Башкірская АССР	1022,0	810,0	410,0	112,0	76,0	10,9	2,0	7,7	15,4	100,0
Татарская АССР	1120,0	980,0	550,0	90,0	35,0	26,7	1,6	12,7	14,0	50,0
Сярэдня-Волскі край	4408,0	3700,0	2250,0	548,0	376,0	114,0	17,7	20,9	19,4	160,0
Ніжня-Волскі край	3410,0	2990,0	2100,0	410,0	296,0	62,3	17,2	20,7	13,8	10,0
Паўночна-Каўкаскі край	2178,0	1200,0	1100,0	953,0	702,0	121,0	47,0	54,2	28,8	25,0
Крымская АССР	238,0	150,0	130,0	82,0	39,0	14,5	5,9	14,3	8,3	6,0
Казакская АССР	1680,0	1290,0	600,0	370,0	297,0	30,6	20,3	14,6	7,5	20,0
Кара-Калпакская АССР	19,6	17,0	13,0	0,6	—	0,2	0,2	0,2	—	2,0
Заходня-Сібірскі край	2701,0	2134,0	1250,0	467,0	350,0	54,0	37,1	20,0	5,9	100,0
Усходня-Сібірскі край	184,0	100,0	65,0	78,0	58,0	4,3	2,5	11,7	1,5	6,0
Якуцкая АССР	34,5	16,0	7,0	4,5	4,0	—	—	0,5	—	14,0
Далёка-Ўсходні край	286,0	200,0	170,0	74,0	40,0	13,2	5,8	6,4	8,6	12,0
Кіргіская АССР	144,0	85,0	60,0	55,0	21,0	17,5	12,5	1,9	2,1	4,0
Украінская ССР	6100,0	4360,0	3805,0	1385,0	718,0	132,0	355,0	110,0	70,0	355,0
БССР	952,0	55,0	300,0	102,0	69,0	22,4	0,8	6,6	3,2	300,0
ЗСФСР	262,0	152,0	112,0	50,0	10,0	19,0	5,8	8,7	6,5	60,0
Узбэкская АССР	550,0	425,0	275,0	95,0	34,0	44,1	0,7	3,8	12,4	30,0
Таджыкская ССР	80,0	61,4	55,0	13,6	1,0	8,2	0,6	0,6	3,2	5,0
Туркмэнская ССР	100,0	80,0	60,0	15,0	1,0	4,2	0,4	4,7	4,7	5,0
Не разьмеркаваныя па мясцовых сэкцыях Цэнтрасаюзу	214,0			214,0				214,0		
Усяго па СССР	36.500,0	27.266,5	17.847,0	6.557,2	3.687,5	943,4	843,8	666,2	416,3	2.676,3

3. Прапанаваць СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, краявым і абласным выканкомам забясьпечыць давядзеньне не пазьней 1 верасьня 1933 г. плянаў і тэрмінаў зяблевага ворыва да кожнага раёну, машына-трактарнай станцыі, калгасу і саўгасу рэспубліканскага і мясцовага значэньня.

Абавязаць Наркамсаўгасаў, Наркамснаб СССР і Наркамзем СССР устанавіць пляны зяблевага ворыва па кожнаму саўгаснаму трэсту аг льнасаюзнага значэньня і забясьпечыць давядзеньне трэстамі плянаў зяблевага ворыва да кожнага саўгасу не пазьней 25 жніўня 1933 г.

4. У пляне работы саўгасаў, МТС і калгасаў прадугледзець ворыва пад зяблева ў першую чаргу для асноўных культур.

5. Абавязаць раённыя зямельныя органы, дырэктароў МТС і саўгасаў і праўленьні калгасаў арганізаваць пільны кантроль за якасьцю зяблевага ворыва, (глыбіня ворыва, добры гарызонт пласта, недапушчэньне агрэхаў і г. д.)

Забараніць залічаць у лік выкананьня ўстаноўленага гэтай пастановай пляну зяблевага ворыва лушчэньне іржышча, пакінуты для яравой сяўбы папар, а таксама прабаранаваныя; але не ўзараныя плошчы з-пад прапашных культур.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР **В. Молатаў (Скрабін).**

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў Саюзу ССР **І. Мірошнікаў.**

З фронту барацьбы за першынства ва ўборцы і пастаўках

(Па тэлеграфу, тэлефону ад РК, палітаддзелаў, нашых карэспандэнтаў і Белта)

ЛОЕЎ

Па раёну скончана ўборка жыта і ячменю. Перадавымі ідуць калгасы: «Новая Беларусь», імя Сталіна, «Дняпроўская камуна». Усяго ў раёне ўбра на жыта 10.363 га і ячменю 1.763 га, у тым ліку калгасамі 6.068 га.

Адначасова трэба адзначыць, што ў раёне недаацэньваецца абмалот, які выкананы усяго толькі на 15 проц. Калгасы абмалацілі жыта з 945 га, аднаасобнікі—з 866 га. Слаба вядзецца барацьба са стратамі. Ручны збор каласоў, не наладжан зерняўлоўнікі былі толькі на некаторых жнівярках.

Раён прыступіў да ўборкі аўса. Убра па 245 га. Дашкевіч.

БУДА-КАШАЛЕЎСКАЯ

Саўгас «Рагінь» сустрэў уборку не падрыхтаваным. Рабочай сілы не хапае. Дырэктар Шышкевіч лічыць, што ён ужо скончыў уборку азімых. Па сут насьці азімыя толькі зжаты і знаходзяцца ў бабках на полі. А да звозкі з поля яшчэ не прыступалі. Не пачыналі таксама і малацьбы. Шышкевіч кажа, што раней трэба ўбраць, бо інакш надвор'е сапсуецца, а пасьля як скончаць усю ўборку, можна будзе распачаць малацьбу, а потым і збожжапастаўкі. Гэтым самым Шышкевіч злоўжывае на парушае дырэктыву партыі і ўраду аб спадучэньні ўборкі з малацьбой і збожжапастаўкамі.

Трэба рашуча ўдарыць па кулацкіх настроях «чарговасьці». Л. Чарнякоў.

***

Калгас «Дружба» № 2, Буда-Кашалеўскай МТС, скончыў уборку жыта і ячменю. Сярэдні ўраджай з гэктара жыта—10 цэнтнераў. З абмалочаных 12 га намалочана 120 цэнтнераў.

На ўсёй зжатай плошчы падтрэблены каласы. Плян збожжапаставак па жыце і ячмені выканан 8 жніўня поўнасьцю.

Пераключаемся на ўборку астатніх яравых. Пачынаем уборку раньняй бульбы.

Ужо закладзена траншэя на 100 тон сіласу, да 16 жніўня закладзем яшчэ адну траншэю на 150 тон.

Старшыня калгасу Ерын.

МСЬЦІСЛАЎЕ

Калгас «Ротэ Фанэ» першым у раёне скончыў уборку жыта.

На агульным сходзе абгаворваючы пытаньне ўборкі і пастаўкі дзяржаве сельгаспрадукцыі, калгасьнікі пастанавілі ўключыцца ва ўсесаюзнае спаборніцтва па ільну. Ужо два дні ў калгасе ідзе цераблеьне ільну.

СЯННО

Па ініцыятыве загадчыцы дзіцячага саду калгасу «Бусішча» арганізаван абор каласоў д

ЗАМАЦАВАЦЬ ВЫНІКІ ЧЫСТКІ

Пасьля 45-дзённай работы камісія скончыла чыстку партыйных радоў у Горацкім с.-г. інстытуце. Апрача таго, што камісія ўскрыла і выявіла шкодніцтва, накіраванае на зрыў пад рыхтоўкі кадраў, апрача ачысткі партыйных радоў ад клясава-чужых нам элементаў, камісія зрабіла вялізарную работу па выхаваньні ленінай часткі камуністаў і па арганізацыі вакол партыі беспартыйнага актыву —прафэсароў, спэцыялістаў і беспартыйнага студэнцтва.

Чыстка мабілізавала камуністаў і беспартыйны актыў на перабудову работы ў інстытуце. Новая дырэкцыя пры дапамозе маладых камуністаў ужо склала профілі, планы і праграмы да навучальнага году.

Аднак, яшчэ далёка ня ўсё зроблена. У спадчыну пасьля 3-хгадовай шкодніцкай работы ў інстытуце засталіся разбураныя лябараторыі, неадрамантаваныя вучэбныя карпусы, студэнцкі інтэрнат на 1.000 чалавек без вады і без наравога ацяпленьня.

Засталася зруйнаваная сталоўка, няма прадуктовай базы для студэнтаў і нарэшце ёсьць пагроза перабояў у заняткох з-за адсутнасьці апалу. (Не хапае 10 тыс. кубамэтраў дроў).

Няма с.-г. машын, трактараў, складаных малатарняў, сяўркі, ільнаце рабілкі і інш., без якіх нельга распачынаць практычную работу.

Для поўнага абсталяваньня лябараторый, для пакупкі с.-г. машын і адпаведнай жывёлы патрабуецца 360 тыс. руб. На бліжэйшы час пакуль што патрэбна 60 тысяч. Інстытут мае ўсе магчымасьці яшчэ і зараз, хоць застаўся кароткі час, абсталяваць частку лябараторый для таго, каб можна было прыступіць да заняткаў. Прафэсары Найдзёнак, Каўцэвіч і інш. прапануюць свае паслугі, дастаць патрэбнае для абсталявань ня лябараторыі, аднак інстытут нічога ў гэтым напрамку ня робіць.

Нічога ня робіцца і па лініі забесьпячэньня прадуктамі студэнцкай сталоўкі. З асыгнаваных на 1933 г. 40.000 руб. для загатоўкі прадуктаў, скарыстана толькі палова гроші. Астатнія 20.000 руб. яшчэ не пераведзены з Наркамзему, а на месцы нічога па закупцы прадуктаў, апрача разважаньняў, ня робіцца.

Для рамонту інтэрнатаў, карпусоў і сталовак толькі 6 жніўня прыехалі інжынэр і тэхнік з Наркамзему. На месцы па рамонце да сёпешняга дня нічога не рабілася. Рамонт толькі распачаўся. Пакуль што тэмпы чарапашыя. Існуе патроза, што да 1-га верасьня рамонт ня скончыцца.

Зусім цярпімае кіраўніцтва з боку апарату Наркамзему. Калі асобныя «кіраўнікі» мінулага Наркамзему (Масюкоў і інш.) сьвядома займалі ся шкодніцтвам, дык аддзел кадраў цяперашняга Наркамзему праяўляе поўную бязьдзейнасьць. За ўвесь час праходжаньня чысткі ў інстытуце ні адзін з працаўнікоў аддзелу кадраў (а іх ёсьць больш 12) не прыязджаў у Горкі, каб азнаёміцца са становішчам інстытуту.

Аддзел кадраў Наркамзему «кірує» сваімі інстытутамі па-старому—фармальна, бюракратычна. Аб гэтым сьведчаць бюракратычныя цыркуляры, у якіх пішацца: «Шліце тэрміно ва весткі аб новым наборы, інакш мы вас аддамо пад суд».

Узяць пытаньне аб выпускніках. З-за шкодніцкай практыкі ў інстытуце, студэнтамі 4 курсу і нават усімі астатнімі курсамі недапрацавана шмат гадзін, галоўным чынам па прафілюючых дысцыплінах.

Так, па агратэхнічным факультэце недапрацавана 890 гадзін, па факультэце ільну і канаплі—1040, па зоатэхнічным—1670 і па плянава-эканамічным—1800 гадзін. Гэта пытаньне патрабуе неадкладнага вырашэньня, бо для гэтага патрэбна працягнуць вучобу на цэлы год. Пакуль гэта пытаньне ня вырашана выключна таму, што Наркамзем інстытутам не займаецца.

Зараз аб самым наборы. Існуе разрыў паміж базай і інстытутам. Базай набору для інстытуту зьяўляюцца рабфакі. Да Горацкага інстытуту пры мацаваны 8 рабфакаў. На сёпешні дзень адзін Горацкі рабфак дае 12 чалавек, а астатнія 7 не даюць ні аднаго. Чаму? Таму, што навучальны год па рабфаку канчаецца 1 студзеня, а ў інстытуце ён пачынаецца 1 верасьня, праз 8 месяцаў. Гэты разрыў і прыводзіць да таго, што студэнты разьяжджаюцца і ў інстытут не нападаюць.

Зусім фармальна адносяцца раённыя камітэты партыі да адбору кадраў для Горацкага інстытуту. Ня гледзячы на ўказаньні ЦК КП(б)Б райкомы гэтым пытаньнем не займаліся. Прыкладам можа паслужыць тое, што калі вярбоўшчык ад інстытуту заехаў у Рэчыцкі раён, дык загадчык культпропу т. Кансінсон толькі цяпер адпукаў паперку ад ЦК і пакляў рэзалюцыю: «зьвярнуцца ў райана». У выніку ўсяго гэтага замест 670 чал. — падана ў інстытут 80 заяў.

І апошняе—гэта аб кадрах для кадраў. У інстытуце не хапае прафэсарска-выкладчыцкага складу і няма загадчыкаў факультэтаў.

Чыстка партыйнай арганізацыі вывела інстытут з «балота». Патрэбна зараз замацаваць усю вялізарную работу, якую правяла камісія па чысткі. Усе магчымасьці для гэтага ёсьць.

Дварэцкі.

ТЭМПЫ, ЯКІМ НЕ ПАЗАЙЗДРОСЬЦІЦЬ ЧАРАПАХА

Даўным-даўно — яшчэ зімой гэтага году — рэдакцыя часопісі «Полымя рэвалюцыі» здала ў друкарню імя Сталіна другі і трэці нумары часопісі. Штомесяц рэдакцыя здавала чарговым нумарам, зараз рыхтуе да здачы ў друкарню дзесяты нумар часопісі—кастрычніцкі. Здаецца, усё ў парадку: часопісь своячасова здаецца, своячасова павінна і выходзіць з друку.

Але даўно прайшла зіма, неўзаметку праляцела вясна, праходзіць лета, на дварэ ўжыня адпаведні наближэньня восені—і друкарня імя Сталіна ўсё зьбіраецца з сіламі і ніяк ня можа сабрацца, каб узяць і выпусьціць з друку чэрвеньскі часопісь за люты і сакавік месяцы гэтага году. Неяк собіла ім выпусьціць чацьверты і пяты нумары, а тут другім і трэцім як селі маркам, так і сядзяць, каторы месяц як пры старым кіраўніцтве, так і пры новым. Ужо каторы тыдзень ляжыць гэтая часопісь надрукаваная, ніяк ня могуць дабраць часу, каб пераплесьці.

Рэдакцыя ішла насустрач, падпускала другую пераплётную; друкарні заставалася толькі перадаць тыраж у гэтую пераплётную і аплаціць за работу. Але-ж і тут аказаўся чарапашы спрыт адміністрацыі: плаціць тропы другім не ахвота, а самім рабіць--тым больш... Ці такая ўжо непасільная работа, каб пераплесьці часопісь? Зьнятае кіраўніцтва мінгасжтару ДВБ, якое займалася «распаўсюджваньнем» часопісі, давяло тыраж да 1300 экземпляраў, дабіла яго «да ручкі». Адміністрацыя друкарні, якая больш паўгоду вышуквае тры-чатыры гадзіны на пераплёт, зьбіраецца мусіць адбыць і «ручкі». Не дапамагаці і спэцыяльныя парады з адміністрацыйнай друкарні, якая вызначала «цвёрдыя», «казачатковыя» тэрміны выхаду легаўскага нумару часопісі ў маі месяцы, у чэрвені, у ліпені... Цяпер ужо жнівень, друкарня абяцае выпусьціць у канцы месяца... Рэдакцыя часопісі, бачачы такія «гераічныя звыш-тэмпы» адміністрацыі друкарні (усё гэта не адносіцца да рабочых друкарні, якія паўпрасі мінуламу ашартуністыкаму кіраўніцтву, праяўляюць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы да выпуску стабільных падручнікаў) прыгрушана была ў сьнежным парадку перапляваць чарговы нумары часопісі ў другія друкарні, каб выратаваць часопісь з рук тупых бюракратаў, якія ня ўлічваюць таго палітычнага значэньня, якое мае своячасовы выхад часопісі, якія злачынна парушаюць пастанову ЦК КП(б)Б аб забесьпячэньні своячасовага выхаду часопісей, якім няма аніякай справы да інтарэсаў чытачоў, да справы беларускай савецкай літаратуры.

Рэдакцыя часопісі, з абурэньнем пішучы аб прыведзеных фактах, шчыра спадзяецца, што пралетарская грамадзкасьць дапаможа наладзіць нармальныя ўмовы для работы адзінае літаратурна-мастацкае часопісі Савецкай Беларусі.

РЭДАКТАР ЧАСОПІСІ «Полымя Рэвалюцыі» МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ.

Страхавую справу ператварыць у сапраўдны вагар аховы сацыялістычнай уласнасьці

Зараз праводзіцца ўсесаюзны рэйд па праверцы выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) аб сельскім акладным страхаваньні. Задача рэйду—праверыць страхавую справу на вёсцы, вывесьці яе з закінутасьці і ператварыць дзяржаўнае страхаваньне ў сапраўдны вагар узмацненьня калгасаў і аховы грамадзкай уласнасьці.

Партыйная своячасова былі ўскрыты скажэньні ў рабоце па страхаваньні. «Страхаваньне на вёсцы,—як гэта гаворыцца ў пастанове ЦК УсеКП(б), —ператварылася ў значнай колькасьці ці раёнаў у легальную форму ашуканства дзяржавы і прыкрыцьця страхавымі актамі вынікаў безгаспадарчасьці і простага шкодніцтва кулацкіх элементаў».

Вось некалькі фактаў таго, як сказалася работа па дзяржаўным страхаваньні ў БССР. У **Жлобінскім** раёне страхавы інспэктар **Даронін** за хабары выдаваў страхавую ўзнагароду за згарэўшыя будынкі, якія ў сапраўднасьці ніколі не гарэлі. У Расонскім раёне выплачвалася страхавая ўзнагарода за зёрн, які загінуў не ад стыхійных павалаў, а з прычыны невыкананьня пасеўнічыкамі—калгасамі і адпаасобнымі гаспадаркамі агратэхнічных правіл. Калгасу **імя Чарвякова ў Хойніцкім** раёне была выплачана страхавая ўзнагарода за 25 коняй, якія палі за час з 28 чэрвеня па 26 кастрычніка 1932 году па невядомых і непаказаных у актах прычынах. Трэба разумець, што гэтыя коні былі шкодніцкі забіты, альбо зьнішчаны іншым парадкам.

Падобных фактаў скажэньня дзяржаўнага страхаваньня ў часе праверкі было ўскрыта па БССР ня мала.

Усе памылковыя інструкцыі НКФ зараз адменены і заменены правіламі аба вязковага акладнога страхаваньня, зацьверджанымі Саюзным Саўнаркомам. СНК БССР у сваёй пастанове ад 14 мая г. г. пра вынікі праверкі страхавой работы, апарату і мерах яго ўмацаваньня даў канкрэтныя дырэктывы аб перабудове страхавой справы на вёсцы. Рэйд, які зараз праводзіцца, ставіць сваёй мэтай праз шырокія колы грамадзкасьці праверыць як гэтыя дырэктывы выкананы або выконваюцца.

Апрача таго ў часе рэйду неабходна шырока папулярызаваць у масах на сельніцтва пастанову ЦК УсеКП(б) аб скажэньнях у рабоце па страхаваньні на вёсцы. Папулярызаваць і дасканала прапрацаваць па сходах калгасьнікаў і працоўных адпаасобнікаў новыя правілы акладнога страхаваньня. Мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў і адпаасобнага працоўнага сялянства на барацьбу з кулацкай агітацыяй супроць страхаваньня і ўсіх спроб клясавага ворага і яго агентуры выкарыстаць справу акладнога страхаваньня для ашуканьня дзяржавы.

Разам з гэтым неабходна праверыць выкананьне пастановы СНК БССР ад 14 мая г. г. «пра вынікі праверкі страхавой работы, апарату і мерах яго ўзмацненьня». Наладзіць работу па правядзеньні дзяржаўнага страхаваньня так, каб ператварыць яго «ў сапраўдны вагар узмацненьня калгасаў і аховы грамадзкай уласнасьці».

Для кіраваньня работаю рэйду склаўдзена рэспубліканская камісія пад старшынствам народнага камісара фінансаў БССР, а ў раёнах—раённыя камісіі пад старшынствам загатоўкаў райфа. У склад раённых камісій, апроч таго, уваходзіць страхавы інспэктар, старшыня райвыканкому саюза фін. банкаўскіх работнікаў, рэдактар раённай газэты і загадчык райза. Для непасрэднай работы на мясцох у кожным раёне павінны быць складзены брыгады. Гэтыя брыгады праводзяць работу ў сельскіх саветах і калгасах і правяраюць страхавую работу і выкананьне дырэктыў непасрэдна ў раённым цэнтры.

Да 1-га верасьня, г. зн. да канчатка вага тэрміну правядзеньня рэйду засталося вельмі мала часу. Таму работу неабходна праводзіць максымальна узмоцненымі тэмпамі, як вял'кую, сур'ёзную і адпаведную работу, якая-б забясьпечыла далей мае ўдасканаленьне і наладжаньне ўсёй страхавой работы на вёсцы.

Пры правядзеньні рэйду ў першую чаргу неабходна зьвярнуць увагу на тое, што раёнамі зроблена па выпраўленьні паасобных фактаў скажэньня у страхавой рабоце, ці прыцягнуты да адказнасьці асобы, якія незаконна выдавалі страхавую ўзнагароду і якія яе атрымлівалі і тым самым наносілі вялікія страты дзяржаве.

Побач з гэтым неабходна дабіцца поўнага ўкамплектаваньня страхавых інспэкцый работнікамі адпаведнай кваліфікацыі і стварыць для гэтых работнікаў належныя ўмовы працы, якія-б забясьпечылі бесперабойнае выкананьне чарговых заданьняў.

Народным Камісарыятам Працы БССР даны раёнам распарадкаваньні зьвярнуць у страхавы апарат былых страхавых работнікаў. Ня гледзячы на тое, што са дня выданьня гэтай пастановы прайшло надзвычай шмат часу, у радзе раёнаў яна ня выканана і да сёпешняга дня.

Работа раённых страхавых камісій пакуль што таксама праходзіць з рук вон дрэнна. Яны ня выконваюць зусім усклаўдзеных на іх саюзным органам абавязкаў. У некаторых раёнах мае месца палітычная недазрэлка новай сыстэмы ліквідацыі страхавых страт праз аўтарытэтныя камісіі. Па іх думцы, відаць стары парадак, пры якім страхавыя прэміі вызначаліся фактычна адным страхавым інспэктарам, што адкрывала шырокае поле дзейнасьці для розных злаўжываньняў куды лепш. Адгэтуль некаторыя раённыя страхавыя камісіі як Дзяржынская, Расонская і інш. і зараз імкнуцца перакласьці свае абавязкі на страхавога інспэктара, а Бярозінская і Церахаўская літаральна бязьдзейнічаюць, не спрабуюць рабіць паваг і гэтага.

Такія адносіны страхавых камісій да сваіх абавязкаў зноў-такі ёсьць сваяасабліва скажэньне палітыкі партыі ў страхавой рабоце і з ім павінна весьціся самая рашучая і бязьлітасная барацьба. Праводзячы работу на наладжаньні страхаваньня неабходна на мясцох праверыць, ці адноўлена выплата страхавых страт, якая дазволена дырэктывай Наркамфіну яшчэ 10 чэрвеня б. г.

Кожны страхавацель павінен памятаць, што страты безадкладна аплачваюцца толькі ў тых выпадках, калі зьнішчэньне ці пашкоджаньне маемасьці зьявілася вынікам стыхійных павалаў і няпчасных выпадкаў, якія не залежаць ад уласьніка маемасьці. Надаварот, ні ў якім выпадку страхавая ўзнагарода ня выплачваецца за страты, якія адбыліся па віне страхавацеля, г. зн. у выніку яўнай безгаспадарчасьці, адсутнасьці аховы грамадзкай уласнасьці або з-за наўмысных дзеяньняў страхавацеля.

Вось асноўныя моманты практычнай работы рэйду. Зразумела, вынікі яго будуць далкам залежаць ад таго, наколькі будзе разгорнута масавая работа і забясьпечан непасрэдны ўдзел у ім шырокіх працоўных мас.

М. А.

БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАЗЫКУ НА ВЁСЦЫ

Узросшыя на аснове посьпехаў будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне энтузіязм і арганізаванасьць шырокіх працоўных мас знаўшлі сваё яркае адлюстраваньне пры падпісцы па пазыку другой пяцігодкі.

На працягу вельмі кароткага часу заданьне па падпісцы сярод гарадзкога насельніцтва выканана на 106,6 проц. і па калгасным сэктары—на 108,1 проц.

Цэнтральная сталіца БССР—Менск —першай выканала свой агульны плян рэалізацыі пазыкі і тым самым паказала ўзор бальшавіцкага змаганьня за мерапрыемствы партыі і ўраду. Добрыя вынікі паказалі таксама раёны **Жыткавіцкі, Вузьдзенскі, Старобінскі, Заслаўскі, Дзяржынскі** і інш.

Аднак, рад раёнаў, які з першых дзён недаацэніў кампаніі, не ўзьняў яе на належную палітычную вышыню, не забясьпечыў выразнай агітацыйна-масавай работы, па сутнасьці прагаляў рэалізацыю пазыкі.

Да гэтых ганебна-адстаючых раёнаў у першую чаргу адносіцца **Чырвонаармейскі** раён. Ён рэалізаваў пазыку толькі на 59,6 проц., а (па адна асобнага сэктару ўсяго на 9,7 проц.) **Бетнаўскі** адпаведна 59,6 проц. і 6,4 проц., **Уваравіцкі**—59,8 проц. і 4,3 проц., **Бешанковіцкі**—60 проц. і 15,9 проц., **Клічаўскі**—60,1 проц. і 8,1 проц., **Церахоўскі**—61,8 проц. і 5,8 проц. і інш.

Лёгчай «Нівоўнага працоўнага без аблігацыі пазыкі першага году другой пяцігодкі» у паказаных раёнах не знайшоў належнага ажыцьцяўленьня. Асабліва трэба падкрэсьліць недаацэнку з боку партарганізацый асобных раёнаў палітычнай важнасьці пасьпяховай рэалізацыі пазыкі сярод адпаасобнага сэктару, заданьне па якім выкананa па БССР толькі на 32,2 проц.

Рад раёнаў, прэвёўшы рэалізацыю пазыкі сярод рабочых, служачых, і калгасьнікаў, па гэтым супакойсяў і спыніў усякую далейшую работу па рэалізацыі яе на самым адсталым вучастку—сярод адпаасобнікаў.

Асабліва вызначаецца ў гэтым сваёй бязьдзейнасьцю **Лёзьнянскі** раён, які заданьне выканаў толькі на 6,2 проц., **Сеньненскі**—на 6,5 проц. **Дубровенскі**—на 7 проц., **Магілёўскі**—на 8,2 проц., **Аршанскі**—на 8,8 проц. і г. д.

Паказаныя недахопы зьніжаюць эфэкт кампаніі пазыкі і тармозяць пасьпяховае яе завяршэньне. Таму партыйныя прафсаюзныя савецкія арганізацыі і ў першую чаргу фінансавы і апячадны апарат павінны прыняць усе меры да таго, каб пераможна завяршыць рэалізацыю пазыкі другой пяцігодкі.

Правядзячы работу на 100 проц. ахопу падпіскай членаў сваіх калектываў, гарадзкія арганізацыі ў парадку шэфства павінны аказаць непасрэдную дапамогу сельскім арганізацыям у найхутчэйшым правядзеньні гэтай работы сярод калгасьнікаў і адпаасобнікаў, павінны забясьпечыць 100 проц. выкананьне заданьня.

Посьпех рэалізацыі будзе толькі тады поўнакаштоўным, калі гроші па падпісцы поўнасьцю паступяць у дзяржбюджэт.

Асабліва значаньне набывае збор сродкаў па пазыцы сярод калгасьнікаў. Узносы па гэтым сэктары павінны былі скласьці ня менш 30 проц. да агульнай сумы падпіскі. Між тым, фактычныя паступленьні па БССР далі толькі 16 проц. Такім чынам **толькі па адным калгасным сэктары мы маем недабор узносаў па падпісцы на суму звыш 2 млн. руб.**

Ёсьць таксама вялікі недабор сродкаў і па падпісцы па пазыку сярод рабочых і служачых. Замест 20 проц. да агульнай сумы падпіскі на ўзносах паступіла толькі 14,7 проц. Усё гэта сьцьвярджае аб тым, што пытаньню паступленьня ўзносаў не надана неабходнай увагі.

Для замацаваньня вынікаў рэалізацыі і далейшага яе пашырэньня неабходна праводзіць сыстаматычную работу па ахопу падпіскай новапаступаючых на работу і замацоўваць гэту рэалізацыю своячасовым і поўным зборам узносаў.

Першая перамога ў справе рэалізацыі пазыкі, заваяваная пад кіраўніцтвам партыі у выніку вялізарнага палітычнага ўздыму і энтузіязму шырокіх працоўных мас, павінна мабілізаваць грамадзкасьць і фінансавы актыў на далейшую барацьбу за справу сацыялістычных накапленьняў.

А. Львоў.

АБ ХОДЗЕ ЎБОРКІ І ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ

Пастанова Менгаркому КП(б)Б ад 11-VIII 1933 году

Сакратарыят Менгаркому КП(б)Б адзначае:

1. Ня гледзячы на тое, што Менскі раён у гэтым годзе значна раней пераёў у гэтым годзе значна раней пераёў у гэтым годзе значна раней пераёў уборку жыта ў параўнаньні з мінулым годам (жнівё азімага жыта па калгасах і ў саўгасным сэктары закончана 9 жніўня г. г.), усё-ж такі ход уборкі астатніх культур (ячменю, аўса) неадпавядаючы (за першыя 11 дзён масавай уборкі ўбрана ўсяго 40 проц. пасеваў збожжавых, а да вышэйчанага ЦК і ГК КП(б)Б тарміну трэба ўбраць яшчэ 25.000 га). Гэта абавязвае ўзмацніць тэмпы ўборкі, але на справе гэтага няма. Неадпавядаючы ход уборкі яравых тлумачыцца тым, што калгасы, дабіўшыся першых посьпехаў ва ўборцы жыта, самазаспакоіліся і дапушчаюць яўны самацёк у рабоце і значнае аслабленьне тэмпаў уборкі і, ня гледзячы на тое, што ў цэлым радзе вучасткаў ячмень і авёс ужо пасьпелі, усё-ж да ўборкі іх як след ня прыступілі.

2. Першыя дні абмалоту паказваюць наяўнасьць вялікага разрыву паміж тэмпамі ўборкі і абмалоту. Ня гледзячы на тое, што раён мае ўсе магчымасьці да хутчэйшага правядзеньня абмалоту, але з прычыны няправільнага скарыстаньня машын (малатарні не працуюць з поўнай нагрузкай—20 гадзін у суткі) работа сіла не даволі правільна скарыстоўваецца, у выніку чаго стварэецца пагроза, што малацьба па раёну значна зацягнецца, што можа зьявіцца тормазам у хутчэйшым правядзеньні збожжаздачы, ссыпкі насенных фондаў і разьмеркаваньні ўраджаю паміж калгасьнікамі.

3. Адзначаючы, што ў паасобных сельсаветах і калгасах устаноўлена традыцыя чарговасьці (з пачатку малацьбы павінулі работу на полі), што зусім недапушчальна, — ГК КП(б)Б абавязвае сакратароў сельпарт'ячэек, саўгасных і калгасных ячэек паставіць работу так, каб абмалот ішоў фразам з уборкай, прадставіўшы штодзённыя весткі ў гарэа аб ходзе абмалоту, выкананьні норм па кожнай малатарні.

4. З прычыны выяўленых фактаў шкодніцтва ў асобных калгасах (у калгасе «Чырвоны спэцыяліст», Сеньнінскага сельсавету пры малацьбе ажа заўся ў снапе кавалак жалеза пакладзены тупы, каб вывесьці са строю малатарні)—звярнуць у апошні раз увагу сакратароў ячэек і старшынь калгасаў на неабходнасьць дасканалай праверкі людзей, пастаўленых ля малатарань.

5. Першыя дні абмалоту паказваюць невыстарчальную ўвагу да пытаньня якасьці абмалоту (шмат зерня застаецца ў саломе), што ГК КП(б)Б расцэньвае, як яўную растрату калгаснай маемасьці, што неабходна разглядаць, як парушэньне закону ад 7-VIII-1932 г.

Абавязаць сакратароў сельпарт'ячэек і калгасных ячэек, брыгадзіраў ГК зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць абмалоту, прыцягваючы інспэктуры па якасьці для праверкі якасьці.

6. Абавязаць членай бюро ГК КП(б)Б, прэзыдыум гарсавету, гарКК прымацаваных да сельсаветаў—неадкладна выехаць у сельсаветы для прыняцьця мер па павышэньні тэмпаў уборкі, абмалоту і здачы збожжа дзяржаве.

7. Узвяліць ініцыятыву камсамолу пра абмежкаваньне 12 жніўня днём масавага падбору калосьсяў на полі па воньту Паўночнага Каўказу. Абавязаць усіх старшынь сельсаветаў і калгасаў да 12 жніўня поўнасьцю зьвезьці ўборнае збожжа, каб даць магчымасьць падабраць калосьсі на полі.

8. Прыняць да ведама, што першым чыгуноным абозам (10 жніўня) у Менск было прывезена 90 тон збожжа.

9. Адзначыць асаблівы ўдарную бальшавіцкую работу Новадворскага і Барайскога сельсаветаў і парт'ячэек гэтых сельсаветаў, у выніку чаго яны на 10 жніўня скончылі здачу дзяржаве па абавязках жыта і некаторую колькасьць ячменю.

10. Рэкамандаваць кандыдатамі на чырвоную ўсесаюзную дошку калгас «Першая конная», Новадворскага сельсавету, калгас «Бальшавік», Каралінчанскага сельсавету і калгас ДПУ, Прыгараднага сельсавету—за своячасовую і добраякасную ўборку, за добрую арганізацыю абмалоту і ператэрміновую здачу жыта дзяржаве (калгас ДПУ амаль што скончыў здачу булбы па абавязках дзяржаве).

11. Адзначыць, што побач з перадавымі сельсаветамі, калгасамі ёсьць такія сельсаветы (Кайкаўскі, Папярнянскі, Астрашыцка-Гарадзецкі), у якіх тэмпы збожжаздачы зусім неадпавядаючыя.

Даручыць тав. Шапіра спэцыяльна абсьледаваць гэтыя сельсаветы пасьля чаго ўнесьці свае прапановы на пасяджаньне сакратарыяту ГК.

Звярнуць асаблівую ўвагу Кайкаўскага сельсавету, што налічваецца ў яго сьпіску ГК КП(б)Б. Гарсавету і ГСПС абавязвае паказаць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы работы.

12. Адзначыць, што ў выніку прапрацоўкі алозвы аднаасобнікаў вёскі Прылучкі, Падгайскага сельсавету, некаторыя аднаасобнікі на 10 жніўня поўнасьцю здалі збожжа дзяржаве (Гатаўскі і Бараўскі сельсаветы). Гэта сьведчыць аб тым, што там, дзе парт'ячэйкі і сельсаветы мабілізавалі ўвагу аднаасобнікаў вакол гэтага ліста—мы маем добрыя вынікі здачы збожжа аднаасобнікамі. У астатніх сельсаветах не разгарнулі работы вакол ліста аднаасобнікаў вёскі Прылучкі, таму і здача збожжа аднаасобнікамі амаль што не праводзіцца.

13. ГК КП(б)Б разглядае факты разбазарваньня збожжа ў калгасах (раздача калгасьнікам больш 10 проц. фактычна абмалочанага збожжа), як яўны кулацкі ўчынак на асобных калгасьніках. Гэтыя факты мелі месца ў выніку абсалютнай бязьдзейнасьці сакратароў сельпарт. і калгасных ячэек, абсалютна недапушчальных адносін з боку брыгадзіраў ГК КП(б)Б, якія ведаюць аб гэтых фактах і ня прынялі адпаведных мер, нават не паведамілі аб гэтым ГК і палітаддзелы.

ГК КП(б)Б катэгарычна папярэджвае, што ў выпадку малейшага адхіленьня ў справе раздачы збожжа ад прынятых пастановай ЦК і ГК КП(б)Б норм да поўнага выкананьня збожжаздачы і ссыпкі фондаў, гаркомам будуць прыняты самыя суровыя меры партыйнага спачуваньня.

14. Адзначыць, што некаторыя калгасы ў рэзультаце кулацкага ўплыву малацілі вільгатнае жыта, ведаючы загадзя, што ў іх прымаць ня будуць, з метай набыцьця магчымасьці раздаць калгасьнікам раней, чым дзяржаве. Адзначыць асаблівую грэшную якасьць здачы збожжа калгасам «Чырвоны агарэнік», Прыгараднага сельсавету. Прыняць да ведама заяву тав. Плотнёва, што палітаддзелам 1-ай МТС прыняты меры спачуваньня да цэлага раду вучастковых работнікаў МТС.

15. Арганізаваць пастаянны паток пастаўкі збожжа дзяржаве саўгасамі, калгасамі і аднаасобнікамі, пакідзіўшы яшчэ раз, што здаваемае дзяржаве збожжа павінна быць высокай якасьці і адпавядаць устаноўленай кандыцыі, што за ня адпаведнасьць збожжа (якое на складзе прыймача бавуньцца ня будзе) і за лішнюю трату часу людзьмі і дарэмную тонку фурманаў—вінаватых будуць прыцягвацца да адказнасьці.

16. Адзначыць, што тав. Жарын ня выканаў дырэктывы ГК КП(б)Б, не разгарнуў адпаведнай работы сярод калгасьнікаў аб недапушчэньні антыдзяржаўных настроеў, якія маюць месца ў Астрашыцка-Гарадзецкім сельсавеце ў справе разбазарваньня калгаснага збожжа. Прапанаваць тав. Жарыну зараз-жа выехаць у Астрашыцкі-Гарадок і разгарнуць адпаведную работу, аб чым далажыць сакратарыяту ГК КП(б)Б.

17. Адзначаючы, што з некаторых калгасаў паступаюць скаргі на недарочнасьці і разыходжаньні паміж фактычнай наяўнасьцю зямлі і той колькасьцю та, якая значыцца за калгасамі ў гарэа; скаргі, што абавязацельствы па збожжаздачы ўручаны калгасам праз выкіданы з большай колькасьці, што фактычна прыводзіць да суперэчных плянаў, прапанаваць гарэа—тав. Жарыну і тав. Турэцкаму—на працягу 5-ці дзён прааналізаваць гэтыя факты і аб прынятых мерах далажыць гаркому КП(б)Б.

Нам. сакратара ГК КП(б)Б **Гершон.**

М. Хведаровіч

БОЛЬШ УВАГІ ВАЕННА-АБАРОНЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

(Да першага ўсебеларускага зьезду савецкіх пісьменьнікаў)

Вялічэзную ролю ў справе выхаваньня працоўных мас адыгрывае мастацкая літаратура. Яна мастацкім словам дапамагае нам хутчэй набудаваць сацыялістычную грамаду, выхаваць мільёны новых людзей з новымі сацыялістычнымі якасьцямі, з новымі поглядамі на працу і сацыялістычнымі адносінамі да яе.

Той факт, што нашу літаратуру творыць не асобныя абраныя людзі, а самі ўдарнікі, рабочыя, чырвонаармейцы і калгасьнікі, зьяўляецца фактам найвялікшага росту і разьвіцьця культуры апырачэйшых працоўных мас якія будуюць сацыялізм. Наша літаратура, дзякуючы таму, што творыцца непасрэднымі ўдзельнікамі будаўнікамі сацыялізму, не адарвана ад усяго жыцьця, а наадварот, як найшырэй і паўней вхапляе ўсе галіны і працесы гэтага жыцьця.

Аднак, сапраўды, Чырвоная армія надзвычай слаба паказана ў нашай савецкай літаратуры.

Праўда, у нас ёсьць творы о перыяду грамадзянскай вайны, якія ў сваіх мастацкіх вобразах малююць гістарычнае мінулае Чырвонай армії, даюць ядзенныя зарысоўкі баёў і шаходаў пад Варшаву, белапольскую акупацыю і дні вызваленьня Беларусі. Да ліку такіх твораў трэба аднесьці творы Якуба Коласа, Міхася Чарота, Ліманоўскага, Нёманскага, Бядулі, Глебкі, Звонака і іншых пісьменьнікаў. Але вялікага твору, у якім была-б паказана мірная баявая вучоба Чырвонай армії—пакуль што няма.

Нашу-ж Чырвоную армію на сёпешні дзень не параўнаеш з арміяй у перыяд грамадзянскай вайны. Разам з пасьпяховым выкананьнем пяцігодкі ад бывалася ўзмацненьне магутнасьці нашай Чырвонай армії, вялізарны рост яе тэхнічнай узброенасьці, што абумовіла выхаваньне дзесяткаў тысяч трактарыстаў, тэхнікаў і матарыстаў з ніпісьменных і малапісьменных шырачэйшых мас рабочых і сялян. Хіба-ж можна рабіць хоць якое параўнаньне з тымі часамі перыяду грамадзянскай вайны, калі мы мелі ў нашай Чырвонай армії такую тэхніку, якая «паляпалася за кошт таго ўзбраеньня, якое адбіралася ў бойках у белагвардзейцаў і замежных інтэрвэнтаў» (Варашылаў).

Правадыр нашай слаўнай магутнай Чырвонай армії Клімент Ефрэмавіч Варашылаў на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) сказаў наступнае пра сучасную Чырвоную армію:

«Чырвоная армія канца пяцігодкі зусім не падобна да Чырвонай армії 1927-28 г., таксама, як наша краіна о не новай эканамічай геаграфіяй, новымі індустрыяльнымі цэнтрамі, новымі прамысловымі гігантамі, саўгасамі і калгасамі зусім не падобна да СССР канца 1927 і пачатку 1928 г.».

Вось гэтыя зьмены ў Чырвонай армії зусім амаль не паказаны беларускай савецкай літаратурай.

Прычынай гэтаму служыць тое, што нашы пісьменьнікі слаба знаёмы з Чырвонай арміяй. Тыя кароткія творчыя камандыроўкі, у якія накіроўваюцца нашы пісьменьнікі, як сьлед ня выкарыстоўваюцца і бываюць надзвычай выпадковымі.

Чырвоная армія мае ў сваіх шэрагах выдатнейшых людзей, якія вынесьлі на сваіх плячох гісторыю грамадзянскай вайны. Гэтыя выдатныя людзі зараз, у мірнай баявой вучобе, выхоўваюць тысячы маладых байцоў—з адсталых у мінулым і малапісьменных рабочых і калгасьнікаў, робяць сьвядомых, перадавых людзей нашай гераічнай эпохі. Брыгада пісьменьнікаў, якая нядаўна наведала чырвонаармейскі лягер надзвычай захаляпася начпадвам №-скай стралковай дывізіі Гарнастаевым, яго скметлівасьцю, шырынёй кругагляду, яго чуласьцю да кожнага чырвонаармейца, зацікаўленасьцю і веданьнем сваёй справы. У шэрагах нашай Чырвонай армії сотні такіх людзей і паказаць іх у нашай мастацкай літаратуры—баявая задача сёпешняга дня.

Тэма Чырвонай армії—гэта тэма вялізарнай інтэрнацыянальнай еднасьці людзей, злучаных адзінай воляй, адзінай клясавай мэтаімкненасьцю і жаданьнем. Яркім прыкладам гэтага можа паслужыць, скажам, вызваленьне Беларусі ад белапалякаў, у якім прымалі ўдзел байцы Чырвонай армії ўсіх нацыянальнасьцяй. Хіба-ж гэта ня тэма для савецкага пісьменьніка?

Чырвоная армія мае права патрабаваць ад нашых паэтаў напісаньня баявой песьні. Другая беларуская дывізія, запісаўшая на сваіх штандарах слаўныя баявыя паходы, барацьбу за Савецкую Беларусь, яшчэ ня мае сапраўднай высокамастацкай баявой песьні, напісанай на матар'яле гістарычнага мінулага і таксама штодзённай баявой вучобы. На стварэньне такой баявой песьні трэба мабілізаваць беларускім паэтам і кампазытарам.

За апошні год зьявілася некалькі твораў, у якіх пачата распрацоўка паказу герояў вайны ў перыяд мірнай баявой вучобы, а таксама паказ тэхнічнай магутнасьці Чырвонай армії. Да ліку такіх твораў трэба аднесьці «Талісман»—Лынькова, «Камандзір Бялінскі»—Глебкі, «Таварыш Краляевіцкі»—Больнага і Кобеца, «Шаюлы і аналядзьні Іл. Барашкі, п'еса Сташэўскага. Але гэта вельмі, вельмі нязначна ў параўнаньні з ростам усёй нашай савецкай літаратуры. Такое зьяв

МНОЖЫЦЬ РАДЫ УДАРНІКАЎ УБОРКІ, АБМАЛОТУ І ПАСТАВАК

РАЗГОРНЕМ ПЕРАКЛІЧКУ—АБМЕН ВОПЫТАМ СПАБОРНІЧАЮЧЫХ БРЫГАД, КАЛГАСАЎ, САЎГАСАЎ, МТС І РАЁНАЎ

Розныя тэмпы, розная якасьць

ВІЦЕБСК. (Брыгада «Зьвязды»).

Высокае, густое жыта, ядраныя, поўныя каласы ячменю, ашаніцы, радуюць, абяцаюць калгасьнікам «**Замасточча**» (Замастоцкі сельсавет) добры ўраджай. Кожны калгасьнік і калгасьніца падлічылі ўжо і ведаюць, сколькі збожжа яны атрымаюць пасьля выкананьня абавязкаў па пастаўках.

Аднак, ня ўсе яшчэ калгасьнікі ўявілі сабе, што заможнае жыцьцё залежыць выключна ад іх саміх, ад таго, наколькі своячасова і добраякасна яны правядуць уборку і абмалот.

Ужо той факт, што на 11 жніўня на палёх калгасу яшчэ засталіся нежатымі звыш 10 га азімых, сьведчыць аб павольных тэмпах работы. У калгасе дзьве брыгады, але працуюць яны па рознаму...

Мы на вучастку брыгады № 2 **Пласкунова.** Працуе адна жнівярка, больш 1,25-1,50 га не выпрацоўвае. Яе не асвоілі. Сам брыгадзір і той ледзь-ледзь спраўляецца з ёю. Зерняўлоўнік не ўстаноўлен. Пасьля праходу жнівяркі на полі застаецца вялікая колькасьць каласоў.

Снапы вяжуць і ставяць у бабкі калгасьніцы **Мар'янавы** Надзя, Мар'я і Маня, яны разам з працуючым на жнівярцы складаюць адно зьвяно і атрымліваюць аднолькавую колькасьць працадзён.

Аднак, якая розьніца ў іх рабоце! **Мар'янава Надзя** працуе ўдарна і добраякасна, зусім ня так, як **Марыля і Маня.** Апошнія ледзь паварочваюцца, пасьля іх вязкі на полі застаецца шмат каласоў.

***

У брыгадзе № 1 **Гусакова** камсамолец **Старавойтаў Пятрусь** лепш асвоіў жнівярку, выпрацоўвае на ёй 3 і больш га. Сьледам за жнівяркай вяжуць у снапы і ставяць у бабкі калгасьніцы - ударніцы **Воўкава Каця, Бэрзіна Вольга, Гаўрыленка Каця, Юркова Вольга** і інш., працуюць ударна, вырабляюць штодзённа ад 1,5 да 1,75 працадні. Якасьць работы ўзорная, — падбіраюць да апошняга каласка.

Чым бліжэй знаёмішся з работай брыгады **Гусакова,** яе зьвеньнямі, тым больш пераконваешся ў поўнай процілегласьці паміж яго брыгадай і брыгадай № 2 **Пласкунова.**

Люба глядзець як працуе ўдарнае зьвяно **Лядзінковай Фёклы.** Яе зьвяно — гэта лепшыя калгасьніцы-ударніцы — **Сяткоўская Ліда, Ляхоўская Варвара, Ляхоўская Вера і Пласкунова.** Апошняя ў свой час была лішэўдарніцай, рабіла прагулы. Узяўшы яе ў сваё зьвяно, **Лядзінкова Фёкла** здолела яе перавыхаваць і зараз Пласкунова ня ўступае лепшым ударніцам.

А вось **Сіроткіну Франю** прышлося са зьвяна выдаліць: лодарнічае, гультайка. Колькі ёй ні гаварылі, колькі не ўгаварвалі — яна ўпарта не выпраўляецца, працуе з халадком, дае дрэнную якасьць. А зьвяно Ледніковай жне жыта ў ручную, замест нормы 0,09 га на чалавека выконвае сыстэматычна 0,12-0 13 га, дае высокую якасьць работы, абсалютна ніводнага каласу не пакідае на полі.

Адна з лепшых калгасьніц-ударніц даярка **Мазуркова Хрысьціна.** Апрача сваёй непасрэднай работы (даеньне тры разы ў дзень) яна працуе штодзенна на полі і сваю норму на жніве ў ручную (0,10 га) **перавыконвае.**

***

Малацьба... Ударныя тэмпы работы. Возчыкі на спэцыяльна падасланых фурманках падвозяць да амбару снапы, якія папярэдня былі высушаны ў ёўнях (дажджы перашкаджалі сушыць на полі).

Машыніст — лепшы калгасьнік-ударнік **Жураў Янаў** невялікімі ахапкамі ўкладвае ў пасьць машыны снапы, яму пасабляе **Старавойтава Каця** — таксама ўдарніца. Дзьве калгасьніцы пераграбаюць салому, якую потым укладвае ў бурты калгасьнік **Сіроткін Лаўрэн.** Зьвяно **Журава** добра ведае сваю норму выпрацоўкі — 30 цэнтн. — 1,25 працадня. Норма поўнасьцю выконваецца.

Брыгадзір тав. **Гусакоў** з гонарам заяўляе: «Першая квітанцыя па пастаўках збожжа дзяржаве ў раёне атрымана маёй брыгадай».

Калгас «**Замасточча**» на 11 жніўня здаў дзяржаве 19 цэнтнэраў жыта добрай якасьці, разьмеркаваўшы паміж калгасьнікамі ў лік авансу на працаднёх 10 проц. фактычнага абмалоту, згодна пастановы ўраду.

Узорна пастаўлена ў брыгадзе Гусакова **ахова ўраджаю.** Вартавыя праважаюцца сыстэматычна пастамі, арганізаванымі камсамольцамі. Тав. Гусакоў добра ведае, што на палёх за сталіся 532 каны і ён прыняў усе меры для аховы калгаснага ўраджаю.

***

На 11 жніўня па калгасах Замасточкага сельсавету засталіся ня зжатымі звыш 70 га жыта. Са зжатых 573,6 га зьвезена толькі 49,8 проц., абмалочана 177,6 цэнтн.

Ячменю зжата 86,5 га, у той час калі ячмень у большасьці калгасаў ужо пасьпеў і яго можна было зжаць на значна большай плошчы.

У калгасах па паасобных вучастках пасьпеў ужо лён, між тым да яго апрацоўкі ня прыступілі.

Арк. Зарубежны, Т. Новажэнец.

Бо на чале сталі бальшавікі

Сяўба падыходзіла да канца. Нават такія далёка не перадавыя сельсаветы, як Тумілішкі, Бразьдзечынскі, засеялі ўжо каля 40 проц. яравога кліну, а ў Баранні сеялі яшчэ ня зьбіраліся. Трактары МТС стаялі без работы, а кіраўнікі сельсавету былі заняты, тым, што пісалі ў раён:

— Гразка, мокра, араць яшчэ нельга.

А ў тых калгасах, дзе ўжо і пачалі палявыя работы — «Трэці год пяцігодкі»,—толку было мала. Працавалі нібы шкрае гарыць. Брыгад зусім ня было, хто якога каня возьме, на тым і працуе, дзе-б хто ні працаваў, атрымліваў «папачку». На работу выходзілі гадзін у 8-9, а браліся за работу добра, калі ў дзесяць.

Яшчэ вясной прыехалі ў Барань работнікі палітаддзелу, да дробязі вывучылі становішча калгасаў, вызначылі кожнага кавалачка пахаці. Выявілі што на чале яўейкі, сельсавету і некаторых калгасаў—кулакі і іх агенты. Было ўстаноўлена, што трактары не працавалі ня таму, што было мокра, а таму, што кіруючыя работнікі сельсавету сабатавалі ранюю сяўбу.

І толькі тады, калі было абноўлена кіраўніцтва некаторых калгасаў—справа пайшла інакш.

Новы сакратар яячэйкі тав. **Кавалёў** перш за ўсё зьвярнуў увагу на тое, хто кіруе калгасамі. У выніку ў «**Трэцім годзе пяцігодкі**» быў выключан старшыня калгасу-кулак **Кавзцкі,** а за ім яшчэ трое —**Шутаў, Тажкашэвіч, Глушкоў.**

Работнікі палітаддзелу т. т. **Разумаў, Гліністы, Герцовіч**—разам з ячэйкай, з новаарганізаваным актывам зрабілі ў сельсавеце круты пералом у рабоце. За самы кароткі час тав. **Разумаў**—начальнік палітаддзелу быў у кожным калгасе, вычуў умовы работы кожнага брыгадзіра, паказваў, як лепш расстаўляць сілы, як улічваць працу і г. д.

Калгас «Ленінскі прызыў» 15 мая скончыў сяўбу, а 25-га ва ўсім сельсавеце сяўба была закончана.

Прапоўку Баранскі сельсавет сустрэў ужо сапраўды ў поўнай гатоўнасьці. Жанчыны былі арганізаваны ў зьвяньні. Практыкаваліся брыгадныя і паміж брыгаднымі лятучыя вытворчыя парады. Узьнік сустрэчны. Брыгадзір адной з брыгад калгасу «**Перамога**» **Сафрановіч Пелагея** бярэ на сябе абавязак павялічыць норму на 30 проц.

— Брыгадзе гэта цяжка ня будзе, бо ў нас кожная калгасьніца працуе без адлучак, сумленна працуе.

І Баранскі сельсавет скончыў прапоўку першым у раёне, 18-га ліпеня скончылі сенаўборку.

Па-баявому рыхтаваліся да жніва. Адрэмонтавалі жнівяркі. Пільна ахоўвалі мы ковы ўраджай.

Калгасы ўхвалілі—дзяржаве здаваць збожжа з першага абмалоту, проста з току ў абавязкова высокай якасьці. А ўборку жыта закончыць ня больш як за 6-7 дзён.

Абавязкі калгасаў выконваюцца сумленна. Першым па сельсавету здаў дзяржаве збожжа калгас «Трэці год пяцігодкі». За ім ідуць і астатнія.

Зараз ужо ўсе калгасы сельсавету пачалі перавораньне папараў. Ідзе падрыхтоўка да пасеву жыта.

На падставе пастановы ЦК УсеКП(б) палітаддзел закончыў у сельсавеце перабудову партыйнай работы і структуры партыйнай арганізацыі, кожны калгас забясьпечан партыйным кіраўніцтвам.

В. Д.

ФЭЛЬЕТОН

ЛІРЫКА І КОДЭКС

Ліст, запумараваны лічбай 7.510, паведамляе:

«Кулак Беклашэнка — былы царкоўны стараста, вёў актыўную барацьбу супроць калгасу. Рэзультат яго барацьбы — 12 выступіўшых беднякоў. Кулак Беклашэнка ціхай сапай пралазіць у калгас. Кулак ужо брыгадзір. Кулак — шкодник: сее лён і не засыпае — лён гніе. Вывозіць угнаеньне не на калгасныя палі, а на сваю былую. Кулак пагнаіў паўтары га сена, пакраў у калгасе 5 парчовых пастрэмкаў, 5 падсядзёлкаў. Сход беднаты патрабуе выгнаньня кулака і шкодніка. Райза зацьвярджае пастанову. Але... старшыня калгасу Скітмянёў выключанага кулака сваёй уласнай рукой зноў прымае ў калгас. Як-жа інакш: кулак апрацоўвае старшыні яго гарод, кулак і старшыня за чаркай. Старшыня калгасу — раскрадвальнік 60 пудоў насеннай бульбы».

Ліст, запумараваны лічбай 7. 510, пасылаецца на рассьледваньне і рэагаваньне ў аршанскае бюро скаргаў КК-РСІ, бо факты, паведамленыя ў лісьце, мелі месца ў калгасе «Чырвоны мэліяратар», Куменіцкага сельсавету, Аршанскага раёну.

І вось хутка атрыман адказ, у якім бюро скаргаў паведамляе, што «факты, паказаныя ў допісе, зьяўляюцца правільнымі». Далей, можна было-б чакаць, што «кулак аддан пад суд, жорстка пакаран. Старшыня калгасу зьнят з работы, аддан пад суд, пастаўлена пытаньне аб яго партыйнасьці з іншымі вынікаючымі адсюль арганізацыйнымі вывадамі». Але не. Мы старанна расьціраем вочы, мы ня верым ім. Але ўсё-ж чорным па беламу напісана:

«Намі прапанавана пад адказнасьць старшыні калгасу і сакратара партячэйкі не дапусьціць Бэклашэнка больш да працы».

— І толькі?

— І толькі.

Пад паперкай подпіс загадчыка бюро скаргаў такі быстры, з крючком—«ПА» — чытай Палей.

Дзякуем, таварышы з аршанскага бюро скаргаў, што адказалі. Апічаслівілі, браткі, зусім апічаслівілі. Падумайце: чакаем вось ужо хутка год адказаў на 72 лісты, пасланыя вам на рассьледваньне (семдзесят два — гэта не апіска). Нарэшце. Дзякуем за адказ, тав. Палей. Да зямлі. нізкі паклон.

72 лісты. З 72 пунктаў Аршанска га раёну паведамляюць аб розных учынках клясавага ворага, аб злодзеях, шкодніках, аб спэкулянтах, ашуканцах партыі і ўраду, аб абураючых агіднасьцях, аб бюракратах, аб хуліганах, аб самадурах, а аршанскае бюро скаргаў маўчыць, ня піша, не рэагуе. Як не падзякаваць за адказ, як не паціскаць бледную руку тав. Палея.

Ня будзем сьляпацца з вывадамі аб дзейнасьці аршанскага бюро скаргаў. Ня к сьпеху. Пакуль ЦКК-НК РСІ БССР разьбяруцца з работай гэтага, з дазволу сказаць, бюро скаргаў або правільней, бюро пахаваньняў рабселькораўскіх лістоў, паслухайце другую гісторыю.

Старшыня Машкоўскага сельсавету Аршанскага раёну Буйніцкі сам жыве ў калгасе «Чырвоная Горка». Там яго сям'я, гарод, гаспадарка, атрыманыя нарэшці з калгасьнікамі. Але чалавек жадніча—яму гэтага мала. Буйніцкі адрэзвае сабе салідны кавалак калгаснай зямлі пад новы гарод ужо ў другім калгасе — «Новая Машкава». Старшыні і гэтага мала. Ён на сут пасьці крадзе калгаснае насеньне бульбы для свайго новага гароду, ён прымушае калгасьніка апрацоўваць свой гарод, ён нарэшце, пагражае выключэньнем з калгасу тых, хто ўказвае на няправільнасьць яго дзеяньняў.

Гэты ліст зноў нападае да нашага старога знаёмага Палея. Але, з прычыны таго, што Палей у літаратуру не заклікаўся, вершаў у раённай маладосьці, выбачайце, ня пісаў, і калі меў адносіны да яра, дык вельмі ўскосныя, выпадковыя, таму патрабаваць ад Палея захаваньня нейкіх там штыляў, удалых эпіцетаў ня прыходзіцца. Ён піша так, як «бог на душу»—коратка і ясна.

«Ваш допіс **кляэтазгодна правераць.** Што Буйніцкі засеяў сабе гарод, не зьяўляецца злачынствам і гі чым сябе не дыскрэдытаваў **У АБШАРАХ КАЛГАСНАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ».**

(Мы падкрэсьліваем буйным шрыфтам самыя ўдалыя месцы гэтага твору. А таксама на падкрэсьленыя месцы просім зьвярнуць, так сказаць, падвойную ўвагу).

«Пасылка на рассьледваньне такіх **БЕСПАДСТАЎНЫХ** допісаў, у якіх **АДСУТНІЧАЕ** неабходны матар'ял для рассьледваньня **ЗАГРАМАДЖАЕ** кантрольную камісію і адрывае яе **АД КАРЫСНАЙ РАБОТЫ.** А таму просьба пры пасылцы допісаў для рассьледваньня **САМІМ ЛЕПШ ПРАГЛЕДЗЕЦЬ** аб мэтазгоднасьці дасылкі на рассьледваньне таго ці іншага матар'ялу.

З прывітаньнем **ПАЛЕЙ».**

Глыбока выбачайце, таварышы з Аршанскай РКК-РСІ, што адрываем ад «карыснай работы», але 72 лісты. 72 абвінаваўчыя акты на вашай незаплямленай сумленнасьці, гэта таксама па-вашаму «заграмаджае вашу работу»? А такія кіраўнікі бюро скаргаў, як **Буры, Ройзэнман** і, нарэшце, гэты таленавіты **Палей** — таксама «карысныя» работнікі?

Мг! — выбачайце.

Аднак, зьвернемся да Палея.

Аб ім чытач мала ведае. Аб ім у БССР ня чуваць было. Нічым гэты «таленавіты» юнак не выкпачаўся. Быў пракурорам у Воршы, быў агентам па снабжэньні ў БелДРЭС'е, цёрся каля рабінай газэты «Ленінскі шлях» — жыў, як гаворыцца, чалавек ціха, нікога не закранаў. Цяперка чалавек праславіўся — аб ім нават у газэтах пішуць.

На разьвітаньне — маленькае запытаньне, тав. Палей, Вы, здаецца, кумекаеце ў крымінальным кодэксе. Гэта вы былі пракурорам Аршанскага раёну (праўда, нядоўга, вас, здаецца «папрасілі» за скажэньне палітыкі і загатоўчых справах. Але ня будзем успамінаць старое). Скажэце, тав. Палей, што гэта за 196 арт. КК БССР? Ня памятаеце. Ну, дык вось: «Нядбайныя або нясумленныя адносіны службовай асобы да службовых абавязкаў, цягвіна...» і г. д. выклікаюць «пазбаўленьне волі да 3-х год»... і г. д. Над гэтым вы навіны прызадумацца.

Б. БРАДОЦКІ.

ЗГУРТАВАЛІ АКТЫЎ

Калі я пачаў працаваць у **Бразьдзечыне**—гэта было ў канцы мая—наш сельсавет па сяўбе быў на апошнім месцы ў раёне. Лепшыя калгасы закончвалі сяўбу, а мы сядзелі на 4-х процантах. А плян веснавых пасеваў у сельсавеце ў параўнаньні в другімі быў багаж што найбольшы. Толькі адзін калгас «Ленінскі шлях» павінен быў засеяць 725 га ярыны. Каля 20 проц. правой плошчы засявалі аднаасобнікі. Усё гэта прымушала нас моцна задумацца над тым, як выбрацца з глыбокага тылу.

У сельсавеце было ўсяго толькі 2-3 камуністы. Амаль увесь цяжар разгортваньня масавай работы ўскладаўся на сельсавет. А папрацаваць было над чым. У большасьці калгасаў існавалі «брыгады». па 120-160 чалавек у кожнай. Дзесяцідворак ня было нават і на паперы.

Мы зразумелі: што трэба скалаціць актыў, ачысьціць калгасы ад кулацкай нечысьці і ўзяцца як сьлед за бальшавіцкую арганізацыю працы.

А тут аказалася, што пры сельсавеце ня ма ні толькі актыву, сакрэтар — ня было нават... прэзыдыуму. З гэтага і пачаў. Нам—мне і новаабранаму сакратару партыйнай ячэйкі **Салаўёву** — прышлося перш за ўсё некалькі разоў зьбіраць старшынь калгасаў, брыгадзіраў, новавылучаных дзесяцідворнікаў. І ня толькі зьбіраць для інструктажу, а і хадзіць да іх у калгасы, у вёскі і практычна дапамагаць у рабоце.

Калі мы гэту работу правялі, калі глыбей улезьлі мы ў калгаснае жыцьцё—зразумелі мы прычыны адставаньня: у радзе калгасаў верхаводзілі кулакі, панавай кулацкія традыцыі ў рабоце. Коні стаялі без корму, на работу выходзілі «скопам», гадзін у 9-10 раніцы.

І тут нам на дапамогу прышоў сельскі актыў і ўсе калгасьнікі-ударнікі, з дапамогай якіх мы ачысьцілі калгасы ад кулакоў, гультаёў і шрагуньпічкаў. Арганізавалі брыгады, аднаасобнікаў арганізавалі мы па дзесяцідворках. Ліквідавалі ў калгасах абязьлінку і ўраўнілаўку. І як пайшлі новыя мэтады работы, дык і па-новаму пачалі мы працаваць.

Прапоўку мы правялі ў тэрмін. Па два разы палолі збожжавыя. 18 ліпеня былі скопаны ўсе сенажаці, а 25-га калгасы пашага сельсавету закончылі здачу сена дзяржаве. Па аднаасобным сэктары здача сена была закончана 3 жніўня.

Усё гэта было зроблена не самацёкам. На прапоцы ў нашых калгасах, як правіла, была ўведзена зьменьнявая зьмешчынна, а ў «Ленінскім шляху» была індывідуальная. Своячасова закончылі мы рамонт касарак, прымацавалі мы да іх лепшых ударнікаў і коняй.

Па ініцыятыве ўдарніка з «Ленінскага шляху» Кузьмы Слука, кожны працуючы на касарцы меў дзве пары коняй, працаваў у дзве зьмены. Таму кожная машына скопвала ў дзень па 5-6 га лугу.

Ня горш падрыхтаваліся мы і да ўборкі, абмалоту і збожжапаставак. Зараз па калгасных палёх у нашым сельсавеце працуе 9 жнівярак—самаскідак і дзве снапавязалкі. Да кожнай прыладжаны зерняўлоўнікі.

Як да пачатку ўборкі, так і зараз у кожным калгасе былі арганізаваны каравульныя каманды. У кожным калгасе абмяркоўвалася пытаньне аб збожжапастаўках і калгасьніцы аднадушна ўхвалілі:

— З першага абмалоту, лепшае збожжа—дзяржаве.

Гэта абавязацельства выконваецца. Калгасы «**Ленінскі прызыў**» і «**Чырвоны ўдарнік**» 1 жніўня здалі дзяржаве каля 10 цэнт. высокаякаснага збожжа.

Работы па падрыхтоўцы і правядзеньні ўборкі былі ў цэнтры ўвагі савецкага актыву. Пры сельсавеце існуе 6 сэкцый і кожная з іх па тым ці іншым вучастку дапамагае ў правядзеньні ўборачнай кампаніі і збожжапаставак.

Жаночая сэкцыя на чале з **Каўфман Аняй** арганізавала і паладзіла работу ясьлей у калгасах «**Ленінскі прызыў**», «**Чырвоны ўдарнік**», «**Ленінскі шлях**» і інш. Бытавая сэкцыя, якой кіруе т. **Праваліўскі,** на аснове масавай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў правяла рамонт дарог і пабудавала звыш 3-х кілёмэтраў новай дарогі ад сельсавету да тракту.

Мы своячасова выконваем нашы абавязкі перад дзяржавай па здачы жыта і ўсіх астатніх культур як па калгасных, так і па аднаасобным сэктары,—гэтыя задачы стаяць у цэнтры ўвагі ўсёй нашай работы.

Зараз з раёну прыслалі нам у дапамогу шэсьць казуістаў. Гэта дасьць нам магчымасьць яшчэ больш умацаваць наш актыў, нашы калгасы і выканаць першую запаведзь—цалкам і своячасова выканаць абавязкі перад дзяржавай.

САРОЧКІН Л.—старшыня Бразьдзечынскага сельсавету, Аршанскага раёну.

ЗЛАМАЦЬ САБАТАЖ АСВАЕНЬНЯ ЗАЛЕЖНЫХ ЗЯМЕЛЬ

(Ліст начпалітаддзелу)

Перад БССР стаіць канкрэтная задача — асвоіць на працягу другой пяцігодкі 5 мільёнаў га залежнай пад засеў пшаніцы. Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, ажыцьцяўляючы дырэктывы ЦК УсеКП(б), абавязаў партыйныя, савецкія і зямельна-калгасныя арганізацыі тэрмінова прыступіць да практычнай рэалізацыі гэтых важнейшых дырэктыў. Прапоўку ужо значны час, БССР наблізкаецца да асеньняй сяўбы, аднак, некаторыя МТС яшчэ толькі не прыступілі да асваеньня залежных зямель і іх раскарчоўкі, але ў радзе выпадкаў проста ці ўскосна імкнуцца сарваць гэта важнейшае мерапрыемства.

Я прывяду характэрны прыклад апартуністычнай недаацэнкі дырэктыў партыі па пытаньні асваеньня залежнай у нашай Плешчаніцкай МТС. У рабоце дзейнасьці яе ёсьць шмат залежнай зямлі, пакрытай пнямі, на месцы ёсьць карчавальныя машыны, але яны стаяць мёртвым капіталам. Дырэкцыя МТС яшчэ не падумалася, каб скарыстаць іх па простым прызначэньні. Калі пытаньнем разгортваньня работ па раскарчоўцы заняўся палітаддзел, дык дырэкцыя стала на дыбы. Дырэктар МТС **Міхайлаў** і старшы агранам **Сымончык** заявілі: «раскарчоўка ў нашых умовах—работа непасільная, у нас няма фундоваў да карчавальных машын і спэцыялістаў, калі-б заняліся гэтай справай».

У чэрвені я зьвярнуўся ў збожжатрактарацэнтр, каб набыць фундоны. Трактарацэнтр пішы-та нашоў нам на сустрач, даў нарад на атрыманьне трактараў «Ф.П.» для Бягомльскай і нашай МТС у Дамаванічах. Калі-ж паехалі туды нашы людзі, ім прадаставілі не трактары, а злюкі. Некалькі чалавек дарэмна страцілі час і грошы і зьвярнуліся з пустымі рукамі. На гэтым па-сутнасьці справа і скончылася. Дырэктары Бягомльскай і Плешчаніцкай МТС засталіся вельмі задаволенымі. Козыр у іх руках. Не атрымаўшы фундоваў, яны зьнялі з сябе ўсякую адказнасьць за раскарчоўку.

А што-ж зрабіў збожжатрактарацэнтр, каб разварушыць марудзячых у Бягомльскай і Плешчаніцкай МТС? Ён задаволены тым, што закрыў вочы «спадкаўчым» палітаддзелам і выліцкай парадзе. А што парад Дамаванічы ня выканалі і асваеньне залежаў гора кіраўнікі Плешчаніцкі і Бягомльскі, гэта ня яго справа.

Паперакор сабатажу апартуністаў дырэктывы партыі аб асваеньні залежных зямель пад пшаніцу з гонарам будуць выкананы. Гэта дакажуць перадавыя калгасы нашага Плешчаніцкага раёну. Выконваюць свае абяцаньні ворыва папару, калгасы МТС узялі каля 18 проц. залежаў і аблогаў. Замаскаваныя элементы прынцыпіяльнага бясспрэчна будуць зламаны. На канкрэтных выпадках у Плешчаніцах і Бягомлі паліталдзелы МТС мабілізуюць калгасьнікаў на барацьбу за асваеньне 5 тысяч га залежаў пад засеў пшаніцы.

Салун.

П. Броўка, П. Глебка

Дзьве брыгады

Мы маем на мэце паказаць сьціплую і дружную працу дзьвюх брыгад, дзе ручаіны людзкіх воль плывуць у адным кірунку, адным рачышчам. Мы з асаблівай цікавасьцю і дапытлівасьцю дамагаліся ад брыгадзіраў сакрэтаў іхніх перамог, але адказы былі надзвычай скупыя.

— Стараемся рабіць добра і дружна,—адказвае коратка брыгадзір Яловік.—Я сам як сьлед ня ведаю, у чым наша сіла,—дадае ён, падумаўшы.—Часта сваяцтва губіць работу. От я вам дам такі прыклад...

Яловік падымае з дароті колас, расьцірае яго на далоні і прабуе белымі зубамі зерне. Сіняе цяпло ягоных вачэй пачынае пераліваецца гарэзьлівымі адцэньнямі. Ён нанава пераживае дзівія падзеі.

— Выбралі мяне вясною за брыгадзіра. Тут некаторыя і пасьмеяліся: «Эт, свой хлапец, вялікай кары ня дасьць, калі што і ня так зробіш»... І от саджалі мы неяк бульбу. Пакуль ганялі адзін загон, усё ішло добра, а як склалі другі, няма каму садзіць у трэцюю баразну, застаецца пуставаць. Бачу я, злачынства выходзіць. Сяргей Гулька і Пеця Прыстаўка далі сваім бабам палёгку.—Чаму? — пытаюся.—Няхай, кажа, адпачнуць. Разумееце, разора застанецца пуставаць, а яны адпачынак даюць і павіраюць на цябе пры гэтым, як сьвятыя. Што я мушу рабіць?

Яловік робіць паўзу і дапытліва кагледае на нас. Мы паціскаем міжвольна плячыма. Тады ён абураецца і гаворыць запальчыва і трохна.

— Я павінен быў забыцца на таварыствы і захаваць свой аўтарытэт брыгадзіра. І я сказаў хлопцам спакойна, але цьвёрда: або ты рабі, або выбірайся да свайго дзядзькі—гультая.

— І правільна зрабілі...

Яловік усьміхаецца задаволена і хітра. Ён сам ведае, што правільна, але-ж у яго ёсьць сястра і маладая прыгожая жонка. Ён хоча быць з імі ласкавым і добрым, але-ж яму трэба быць справядлівым, а значыць часамі гнеўным і жорсткім.

— І праз гэта, скажу вам, было трохі і крыху і сьлёз,—вінавата прызнаецца Яловік,—але я быў цьвёрды да канца. Інакш нельга: каб я даў якую палёгку сястры або жонцы, прапала-б уся мая справядлівасьць. Хто-ж бы тады слухаў мяне і верыў мне? Сваяцтва, відома, ня лёгка перамагчы, але ў чэснасьці аснова брыгаднай дружнасьці.

Кожны новы чалавек, яшчэ мала знаёмы з калгасам «Чырвоная зорка», нязменна дае ў такіх выпадках разумнае, на перыны погляд, пытаньне:

— А чаму маладых і прыгожых жонак канечна трэба ставіць на работу ў тую брыгаду, дзе муж за брыгадзіра?

Яловік маўкліва і гіранічна доўга аглядае нас з ног да галавы і роўна праз хвіліну дае адказ:

— Прабавалі... У нашых умовах—інакш нельга.

Высьвятляецца, што пры такім тэрытарыяльным разьмяшчэньні калгасу інакш расставіць рабочую сілу сапраўды ніяк нельга. Справа ў тым, што калгасьнікі раскіданы па ўсім сяле Кішчына-Слабада, якое ў сваю чаргу адбеглася ад праўленьня і калгаснага цэнтру на кілёмэтраў два. У такіх варунках, каб вы траціць часу на пераходы з вёскі ў праўленьне калгасу пры зборы на працу—брыгады арганізаваны па прынцыпе месца пражываньня. Кожная далёкая ад праўленьня брыгада мае на тым ці іншым канцы сяла свой двор, сваё месца збору, адкуль яна непасрэдна выходзіць на працу. З другога боку, пры такім прынцыпе арганізацыі брыгад удзельнікі брыгады не адарваны адзін ад другога і брыгадзір мае поўную магчымасьць быць у курсе іхняга штодзеннага хатняга жыцьця.

А гэта вельмі важна,—загараецца Яловік.—Вы згодны?

Так, мы згаджаемся, што расстаноўка сіл вельмі разумная, аднак, каб ня было ніякіх нараканьняў, варта было-б нарушыць прынцып і маладую і прыгожую жонку брыгадзіра паставіць у іншую брыгаду.

Барыс Яловік абражаны нашай падазронасьцю, але спакойна і холадна даводзіць, што карысьней, калі ўся сям'я калгасьніка знаходзіцца ня ў некалькіх, а ў адной брыгадзе. Гэта-ж відаць з самой практыкі. От ідзеце, вы, напрыклад, на полудзень. Прыходзіце да хаты. На дзьверах вісіць вялізарны замок. Ключ ад яго дзесьці ў маладой жонкі, якая працуе ў другой брыгадзе. Яна вернецца толькі праз гадзіну, бо там канчаюць жніво і палуднаваць будуць пазьней. Вы пачынаеце чакаць—поўгадзіны, сорак хвілін, нарэшце, калі ўжо ваша брыгада ідзе на работу, вы ў роспачы вымаеце з вакна раму і ўлазіце ў хату. Пакуль вы там рэвізуеце гаршкі, палуднаваць ужо і няма калі.

Як вам падабаецца такая расстаноўка сіл?—сьмяецца Яловік.

Зразумела, што нам гэта не падабаецца, лепш ужо няхай маладая і прыгожая жонка працуе ў адной брыгадзе з мужам, абы толькі ня было ніякіх непаладак і нараканьняў.

— Уся сіла ў брыгадзіравым сумленьні,—запэўняе нас малады бялявы мужчына, брыгадзір першай брыгады Іван Сяргеевіч Дакука, якога мы толькі што сустрэлі, вядучы гэту размову. Ня верыць яму—у нас няма ніякіх падстаў. Іван Дакука—лепшы ўдарнік і арганізатар. Летась за добрую ўборку ён быў прэміяваны, сёлета—першы скончыў веснавую сяўбу, засеяўшы некалькі гэктараў звыш заданьня і дапамогшы камсамольскай брыгадзе. Сена яго брыгада гаксама накасіла больш за іншых, хоць сілы ў іх былі роўныя. Першаю яна скончыла і жніво азімых.

— А колькі вы зжалі?—пытаемся мы.

— Колькі зжалі...

— Сорак тры гэктары,—перабівае яго шчупленькі, як верабей хлапчук, Круглікаў Коля.—А заданьне было толькі трыццаць сем. Мы больш за ўсіх зжалі,—хваліцца ён, пабліскваючы блакітнымі вачанятамі.

Дакука ласкава трасе яго за вуха:

— А ты, пацан, ня вылазь наперад, дай мне слова сказаць, я ўсё-ж такі твой брыгадзір.

І брыгадзір расважліва апавядае, як яны дамагаліся такіх перамог, пад крэсьліваючы яшчэ такі добрую расстаноўку сіл, эканомную і ўважлівы падыход брыгадзіра да кожнага калгасьніка, правільны падлік працы і, на гэтай аснове, вялікую старанасьць і дружнасьць саміх калгасьнікаў. Ён з гонарам апавядае нам пра лепшых ударнікаў, пра Мацьвея Трасьніцкага, маладога яшчэ хлапца, круглага сірату, на руках у якога дзьве маленькія сястры, аднак, рукі якога спраўляюцца на ўсялякай рабоце лепш за іншых.

Слухаючы гэту цёплую і шчырую гутарку Дакукі, мы пераконваемся, што сапраўды, брыгадзірава ўважлівасьць і заклапочанасьць пра кожнага калгасьніка—найлепшая сьцежка да нутра гэтага чалавека, супярэчлівага, як само жыцьцё, найлепшая аснова для шчыльнай зьнітаванасьці ўсёй брыгады.

І нашы меркаваньні пацьвярджаюц па яшчэ раз.

Быў якраз перапынак па полудзень. Мы сядзелі ў хаце Барыса Яловіка. Ён толькі што вярнуўся з поля, поўны яшчэ гаспадарчай заклапочанасьці і думак.

— Ах, ліха на яго, забыўся,—сарваўся ён з месца і выбег з хаты.

— Сяргей! Сяргей,—залунаў ягоны голас над вуліцай, па летняму спакойнай, пыльнай і душнай.

Гулька вярнуўся і мы чуем праз вакно іхнюю гамонку:

— Заскоч, браце, па дарозе ў кузьню і скажы Андрушку, каб зрабіў пра запас пару ці штук тры от такіх штучак.

— Яловік паказвае шрубку, якою прымацоўваюцца ў жнівярцы нажы.—Глядзі-ж, браце, не забудзься, — паказвае ён яшчэ раз.—Я зьбегаў-бы сам, але трэба нажы падтачыць, папалуднаваць...

— Дык ты ідзі, палуднуй, я зраблю.

Але Яловік стаіць усе яшчэ чамусьці на вуліцы. Ён пазірае кудысь ці за новую агарожу царквы, што разьмясьцілася перад самымі вокнамі старэнькай Яловікавай хаты, паперад пляцу, зарослага белым пахучым рамонкам.

— Чаго ён там стаіць?—выглядае зацікаўленая Яловікава жонка за вакно і, ськемяўшы чагосьці, пачынае злаваць:—От-от, зноў будзе бяз полудню. Паўла ідзе касу клапаць...

У хату ўваходзіць Яловік і Паўла Казак. Ён шчупленькі, як шчытол, відаць, што прырода не падзяліла яго ліпняю сілаю. Аднак, калі ў брыгадзе разьмяркоўвалі работу, Казак не згадзіўся быць за конюха і выпрасіўся на касьбу. Брыгадзір бачыў, што хлопцу будзе цяжка, але-ж ён ведаў і другое, што па сенажаці самы разгон і весёласьць і што маладому выседзець у такі час дома, яшчэ будзе цяжэй.

— Ідзі,—сказаў ён,—я памагу.

І цяпер Яловік правіць Паўлу касу, дапамагае словамі і работаю. Жонка крыху косіцца за гэта:

— От бяз полудню будзеш праз сваю дабрату.

Гэтакі хлапец, а касы не наладзіць... Як-жа ты жыць будзеш? — зварачаецца яна ўжо непасрэдна да Паўла.

Казак пераступае з нагі на ногу.

— Ты не зважай на яе,—супакойвае Яловік,—няхай пагамоніць, ня слухай...

Ад гэтых слоў становіцца лёгка і добра. Чалавек ахвотна пойдзе на любую работу, спакойна, бяз усякай лаянкі, бо ён ведае, што яму дапамогуць, што яго працу ацэняць справядліва. На гэтай аснове вырасла дружнасьць і зьнітаванасьць першай і трэцяй брыгады, на гэтай аснове вырасла і людзкая старанасьць шчырая і сумленная. Ад яе заўсёды весела і шумна на вучастках гэтых брыгад.

— Памажэце нашым дзяўчатам мэндлі ставіць,—гукае на нас Хрысьціна Клімашонак.—Прыгожую жнуку высватаем,—жартуе яна.

— У вас-жа няма прыгожых, — пакепліваем мы.

— Вы самі няпрыгожыя,—умешваюцца пакрыўджаныя дзяўчаты, і пад іхнімі рукамі весялей шалясьціць салома, спраўней абвіваюцца пераваслы. Клімашонак бярэ сваіх дзяўчат пад абарону:

— Яны, можа, не занадта прыгожыя, але затое работніцы, якіх пашукаць трэба.

Паліцэйскі налёт на кватэру бэрлінскага карэспандэнта „Правды" т. Чэрняка

БЭРЛІН, 13. (ТАСС). 12 жніўня быў праведзен вобыск у кватэры бэрлінскага карэспандэнта «Правды» тав. **Чэрняка. Тав. Чэрняк быў арыштован.** Прычыны арышту невядомы. Пры вобыску ўзяты копіі тэлеграм, перададных карэспандэнтам у «Правду», матар'ялы падабраныя для інфармацыі, выразкі з газэт і часопісяў, пасобныя нумары часопісяў «Большевик», «Коминтерн» і газэты «Правда».

Паўпрэдзтва СССР, паведаміўшы аб вобыску і арышце міністэрства замежных спраў, патрабавала вызваленьня т. Чэрняка. Міністэрства абяцала неадкладна прыняць меры да высьвятленьня справы і потым паведаміла, што Чэрняк не арыштован, а толькі «адвезен у паліцыю для допыту па справе знойдзеных у яго матар'ялаў». ПАСЬЛЯ 3-ГАДЗІННАГА ЗНАХОДЖАНЬНЯ Ў ПАЛІЦЫІ ТАВ. ЧЭРНЯК БЫЎ ВЫЗВАЛЕН. Паліцыя ня склала вопісу па ўзятым ў т. Чэрняка матар'ялы.

***

У камэнтарах да тэлеграмы «Правды» піша: «Вобыскі ў кватэры карэспандэнта «Правды», арышты і допыты карэспандэнтаў, відавочна пачынаюць уваходзіць у сыстэму мерапрыемстваў фашысцкіх уладаў. Першы вобыск, у пачатку сакавіка, ня даў паліцыі ніякіх пажаданых рэзультатаў. Паліцыя не змагла прад'явіць ніякіх абвінавачаньняў карэспандэнту «Правды», які добрасумленна выконваў свае простыя абавязкі. Такім-жа бязвыніковым аказаўся і другі вобыск, і паліцыя вымушана была праз некалькі гадзін вызваліць карэспандэнта. Усе гэтыя інцыдэнты характэрны для сучаснага становішча ў Германіі. Яны ярка асьвятляюць абстаноўку, створаную намаганьнямі фашысцкіх уладаў для работы прадстаўнікоў замежнага друку ў Германіі наогул і савецкіх карэспандэнтаў у прыватнасьці. Прыядычныя налёты, захват матар'ялаў бяз вопісу— усе гэтыя тыповыя прыёмы паліцэйскай правакацыі пушчаны супроць прадстаўнікоў найбольш уплывовай газэты краіны, з якой, па заяве кіраўнікоў Германіі, яна імкнецца падтрымліваць прыяцельскія адносіны. Савецкая грамадзкая думка ня можа прайсьці міма такіх бязупынных спроб затрудніць работу савецкага карэспандэнта ў Германіі. Яна вітае крокі, прад прынятыя паўпрэдзтвам СССР у Бэрліне, і чакае, што савецкаму карэспандэнту будзе прадастаўлена, нарэшце, магчымасьць для нармальнай работы.

Ангельская незалежная партыя прыняла рэвалюцыйную пляцформу

ЛЁНДАН, 10 (Белта). Генэральны сакратар незалежнай рабочай партыі **Патон** адмовіўся ад свайго паста. У заяве Патон указаў, што будзе выконваць свае абавязкі да сьнежня. Нацыянальны савет прыняў адстаўку Патона і назначыў на яго месца **Броквэя. Мэкстон** захоўвае за сабой пост старшыні да наступнай канфэрэнцыі. Пасьля доўгай дыскусіі нацыянальны савет большасьцю 10 галасоў супроць 5 прыняў новую пляцформу, у якой гаворыцца, што праўдападобнае разьвіцьцё ў Англіі ва ўмовах закату капіталізму прывядзе да дальнейшага пагаршэньня ўмоў жыцьця рабочай клясы. У заяве аб новай пляцформе прапануецца «ў асноўным выходзіць з неабходнасьці арганізацыі рабочых для ажыцьцяўленьня рэвалюцыйнай сацыялістычнай праграмы».

«Сучасная супрацоўніцтва з кампартыяй»,—указваецца далей—павінна разглядацца, як першы крок у рэалізацыі сапраўднага яднаньня сіл рабочай клясы для дасягненьня рэвалюцыйных мэтаў. Неабходна працягваць супрацоўніцтва і імкнуцца ўцягнуць у яго іншыя рабочыя арганізацыі са складу лейбарыстскай партыі, трэд'юніёнаў, кааперацыйнага руху і інш. арганізацый, гатовых да супрацоўніцтва». Мяркуецца прымаць актыўны ўдзел у руху камітэтаў радавых членаў прафсаюзаў і працаваць таксама па іншых лініях, каб узмацніць барацьбу супроць няспрашнага рэфармісцкага кіраўніцтва. У пляцформе далей гаворыцца, што Патон у апазыцыі да гэтай палітыкі і таму падаў у адстаўку, якая і прынята. У заяве аб новай пляцформе гаворыцца таксама, што капіталісты будуць усё больш і больш ужываць фашысцкія мэтады. Ускладненьні, гаворыцца далей, будуць таксама ўзьнікаць у сувязі з разьвіцьцём сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, з палітычнага і эканамічнага разьвіцьця прыгнечаных нацый і з небясьпекі новай вайны.

За пляцформу галасавалі: Броквэй, Мэчтон, Сьміт, Отэфэнсон, Гартон, Гастэр, Гэнц, тры жанчыны—Уі, Спэраль і Джуусой. Супроць галасавалі: Джаусэ, Кампбэл-Стэфан, Сэндхэн, Адэмс і Уільямс.

Уздым забастовачнай хвалі ў Польшчы

ВАРШАВА, 13. (Упасн. інфарм. «Зьвязды»). Наступленьне капіталістаў на зарплату рабочых ахоплівае ўсе галіны прамысловасьці Польшчы. Усьпед за прадпрыемцамі Верхняй Сілезіі і Дамброўскага басэйну пачалі на ступленьне на зарплату рабочых нафта выя бароны. 30 ліпеня ў ПАТОКУ (Краканўскае ваяводзтва), паміж нафтавымі прадпрыемцамі і прадстаўнікамі рабочых Кросьненскага басэйну адбылася канфэрэнцыя. Прадпрыемцы патрабавалі скасаваньня калдагавору, зьніжэньня зарплаты і пагаршэньня ўмоў працы. Заява прадпрыемцаў вынікала вялікае абурэньне сярод рабочых. Рабочыя аднагалосна прынялі па станову, у якой гаворыцца, што яны ніколі ня згодзяцца на скасаваньне калдагавору і зьніжэньне зарплаты, і што калі прадпрыемцы будуць настойваць на сваіх патрабаваньнях, то ўсе нафтавыя рабочыя РАСПАЧНУЦЬ АГУЛЬНУЮ ЗАБАСТОЎКУ, ЯКУЮ БУДУЦЬ ВЕСЬЦІ ДА ПОЎНАЙ ПЕРАМОГІ.

Ужо 22 дні цягнецца забастоўка 1300 РАБОЧЫХ, занятых на грамадзкіх работах ў ЧЭНСТАХОВЕ. Ня гледзя чы на вельмі цяжкія ўмовы, у якіх праходзіць забастоўка, рабочыя адчуваюць сябе бадзёрымі. Вакольнае насельніцтва арганізавала матар'яльную дапамогу бастуючым. Учора паслана на працу брыгада рабочых дапучылася да бастуючых. Упады прабуюць разбурыць палаткі забаставаўшых, на што рабочыя рыхтуюцца адказаць галадоўкай.

Адбываецца далей забастоўка будаўнікоў у ВАРШАВЕ. Прэса паведамляе, што ў знак салідарнасьці выбухнулі забастоўкі будаўнічых рабочых у ЛОДЗІ, ОЗОРКОВЕ І ЗГЕЖУ. Гэтымі днямі выбухнула таксама забастоўка брукароў у ВАРШАВЕ. Бастуе 200 чалавек. Брукары патрабуюць заключэньня калдагавору і павышэньня зарплаты. Учора мелася адбыцца канфэрэнцыя паміж бастуючымі брукарамі і прадпрыемцамі. Прадпрыемцы не зьявіліся на канфэрэнцыю, заяўляючы, што яны ня хочуць выслухоўваць рабочых. 11 жніўня выбухнула забастоўка ў цагельні ПУРТЫ, якая пачалася з прычыны зьніжэньня зарплаты. Бастуе 30 рабочых.

ВІЛЕНСКІЯ КРАЎЦЫ патрабуюць заключэньня калдагавору і павышэньня зарплаты. Краўцы заяўляюць, што калі ў бліжэйшыя дні ня будуць задаволены іхнія патрабаваньні, яны пачнуць забастоўку.

Працягваюць баставаць 200 рабочых на ВІЛЕНСКІХ ЛЕСАПІЛЬНЫХ ЗАВОДАХ. Усе перагаворы паміж прадпрыемцамі і рабочымі ня далі ніякіх вынікаў.

Забастоўка маляроў у ВІЛЬНІ, якая выбухнула некалькі дзён таму назад, скончылася перамогай рабочых. Рабочыя дабіліся павышэньня зарплаты з 5 да 6 злотых і жанчыны з 4 да 5 зп. у дзень.

Паўстаньне ў арміі Кубы

НЮ-ЁРК. Агенцтва «Асошыэйтэд прэс» паведамляе, што значная частка кубінскай арміі паўстала і патрабуе адстаўкі дыктатара Мачато на працягу 24 гадзін.

АБЛАВА НА КАМУНІСТАЎ

БЭРЛІН, 12 (БЕЛТА). Праведзена вялікая аблава на камуністаў у **Абэршэнвальдзе** (прадмесьца Бэрліна), у часе якой нібыта знойдзена шмат літаратуры. **Арыштавана 40 чал.** Паліцэйскае паведамленьне сьцьвярджае, што шукаюць былога кандэпутата прускага ландтагу **Саботка**, які сталў на чале камуністычнай арганізацыі і кіраваў пашырэньнем камуністычных лістовак. Сам Саботка, згодна паведамленьня паліцыі, зьнік з сваёй кватэры і таму ня быў арыштаваны. Частка арыштаваных адпраўлена пад суд, а частка накіравана ў канцлягер.

НЯУДАЧА ПРАГРАМЫ РУЗВЭЛЬТА

ЛЁНДАН, 11 (БЕЛТА). Друк са злараднасьцю адзначае няўдачу праграмы Рузвэльта. «Вельмі паказальна — піша вашынгтонскі карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф» — што ўсюды прадпрымаюцца **стачкі, лёкаўты і пікетаваньне,** ня гледзячы на тарачы заклік прэзыдэнта да перамір'я на бліжэйшыя крытычныя тыдні».

Н'ю-Ёрскі карэспандэнт «Манчэстэр гардыян» указвае, што дзеяньне закону аб аднаўленьні прамысловасьці пачынае выклікаць сур'ёзны непакой.

Сумная пэрспэктыва польскіх выдаўцоў

Буржуазная культура, як і ўся буржуазная грамадзкасьць, няўхільна коціцца да свайго заняпаду. Кожны новы дзень прыносіць усё новыя факты закату буржуазнай культуры.

Апошні «Дзеньнік Віленскі» друкуе данны аб скарачэньні тыражу кніжак у Польшчы, якія ясна паказваюць, куды ідзе культура буржуазнай Польшчы.

«Становішча на выдавецкім рынку,—піша газэта,—на працягу апошняга году значна пагоршылася. Як паказваюць апошнія падлікі, колькасьць друкуемых назваў зьменшылася на 7,8 проц. Гэта лічба яшчэ невялікая. Але сапраўдзе становішча мы ўбачым толькі тады, калі возьмем лічбу тыражу. Колькасьць экземпляраў надрукаваных на працягу апошняга году кніжак зьменшылася параўнальна з мінулым годам на 52 проц.».

Як відаць з гэтай заметкі, **на працягу аднаго году тыраж скараціўся больш чым напалову.** Калі і ў далейшым скарачэньне тыражу пойдзе такім-жа тэмпам (а гэта зусім магчымая рэч!), то праз год польскім выдавецтвам прыдзецца наогул спыніць сваю дзейнасьць.

Н.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

* Паводле даных «Ведомосьці статыстычна», польскі імпарт за першае паўгодзьдзе 1933 г. ў параўнаньні з 1931 г. зьменшыўся на 53 проц., экспарт — на 94 проц.

«Газэта Варшавска» характарызуе становішча польскага замежнага гандлю, як катастрафічнае.

* 43 проц. бюджэту Злучаных Штатаў прызначаны для ваенных мэт.

З бюджэту ў 4,25 млрд. даляраў.— 1.628 млн. даляраў прадугледжаны на ўтрыманьне і павялічэньне арміі. З гэтай сумы 525.670 тыс. даляраў ідуць на агульныя мэты нацыянальнай абароны; 2.210 тыс. даляраў — на ваенныя пабудовы, 15.321 тыс. даляраў— на авіацыю і 43.245 тыс. даляраў — на марскае будаўніцтва.

* З Гаваны (Куба) паведамляюць, што Мачадо еще ў водпуск. Мяркуюць, што ён хутка падасьць ў адстаўку.

Загад Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету СССР

1. Прызваць на сапраўдную ваенную службу ў рабоча-сялянскую Чырвоную армію ў пэрыяд з 1 верасьня па 1 лістапада г. г. грамадзян нараджэньня 1911 г. і старэйшых узростаў, якім мінулі адтэрміноўкі прызыву.

Дакладныя тэрміны прызыву ўстанавіць рэвалюцыйным ваенным саветам округ.

2. Грамадзян нараджэньня 1903 г., якія раней карысталіся адтэрміноўкамі, ад прызыву вызваліць і пералічыць у запас першай чаргі.

Падстава: Арт. 131 закону аб абавязковай ваеннай службе.

Народны камісар па ваенных і марскіх справах і старшыня РВС СССР ВАРАШЫЛАЎ.

10 жніўня, 1933 г. г. Масква.

Загад Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету СССР

1. Звольніць з рядоў рабоча-сялянскай Чырвонай арміі ў доўгатэрміновы водпуск радавы і малодшы начальніцкі склад тэрміновай службы:

а) з часьцей з 2-гадовым тэрмінам службы—прызыву 1931 г.;

б) з часьцей з 3-гадовым тэрмінам службы—прызыву 1930 г.;

в) з часьцей з 4-гадовым тэрмінам службы—прызыву 1929 г.;

г) асоб, якія праходзяць сапраўдную ваенную службу ў парадку X разьдзелу закону пра абавязковую ваенную службу, вытрымаўшых іспыты на званьне сяржанта начальніцкага складу запасу.

2. Звальненьне правесьці:

а) з сухаземных, паветраных і марскіх сіл у пэрыяд з 25 верасьня па 15 сьнежня г. г.;

б) з канвойных войск СССР—к 15 сьнежня г. г.;

в) з унутраных войск АДПУ—к 15 студзеня 1934 г. і пагранічнай аховы—к 1 красавіка 1934 г.

3. Пераменны радавы і малодшы начальніцкі склад тэрытарыяльных часьцей прызыву 1928 г. звольніць у запас пасьля скапчаньня збораў тэрытарыяльных часьцей бягучага году.

4. Загад абвясьціць ва ўсіх ротах, эскадронах, батарэях, камандах, атрадах, дывізіёнах, суднах і экіпажах.

Падстава: Арт. 40 закону аб абавязковай ваеннай службе.

Народны камісар па ваенных і марскіх справах і старшыня РВС СССР ВАРАШЫЛАЎ.

10 жніўня 1933 г. гор. Масква.

НА БЯГУЧЫМ РАХУНКУ—301.190 РУБЛЁЎ

Паступленьні за 13 жніўня зусім нязначныя — усяго 5.791 руб. ад наступных устаноў і прадпрыемстваў гор. Менску: гарадзкой касы ашчадносьці — 87 руб., аргвучэдзяленьня «Дынамо»—165 руб., выдавецтва «Зьвязда»—92 руб., выдавецтва «Акцябр»—174 руб., завочнага мэдінстытуту—24 руб., ад інстытуту ўдасканаленьня дактароў—23 руб., менскай працоўнай фабрычнай калёніі—391 руб., ад Менбуду—500 руб., ясьляй № 6—47 руб., нарсуда 1 вучастку—7 руб., райспажыўсаюзу—127 руб., заводу «Ўдарнік»—250 руб., цэнтральнага дому ФК—133 руб., Дзяржшвэйманшыны—61 руб., Белдзяржсыпірту—770 руб., ад гар. бульбяной трактарнай станцыі—411 руб., прамбанку—500 руб., белкіраўніцтва сувязі—185 руб., УВОР-90—127 руб., цагельнай № 5-6—303 руб., заводу «Чырвоны золак»—428 руб., Белдзяржснабу—55 руб., касы райзагу—73 руб., штабу №-й брыгады ваенспэцчасьцей—74 руб., арцелі Менграмхарчу—200 руб., менскай пантовай канторы—32 руб., менскай базы БКС—210 руб., ад каапгандлю—237 руб. Усяго на бягучым рахунку ліквідавана 301.190 рублёў. Неабходна ўдзесяцярыць тэмпы збору сродкаў. Чакаем адказу з раёнаў.

Пабудаваць дарожную сетку, якая-б адпавядала інтарэсам народнай гаспадаркі

Да ўсіх бюро ІТС

Па заданьню ўрадавых органаў Галоў дартранс БССР прыступіў да важнейшай работы на правядзеньню комплекснага і тытульнага эканамічнага вышуканьня аўта-гужавых дарог БССР.

Гэтая работа мае вялікае значэньне як для правільнага плянаваньня дарожнага будаўніцтва і разьвіцьця аўта-гужавога транспарту, так і для правільнай увязкі і каардынаваньня работы ўсіх відаў транспарту паміж сабою, для правільнай увязкі геаграфічнага разьмяшчэньня вытворчых сіл з дарожнай сецьцю рэспублікі.

Складанасьць правядзеньня данай работы заключаецца ў тым, што яна ў БССР праводзіцца ўпершыню і ня мае за сабою дастаткова накопленага вопыту.

У выніку правядзімых работ будзе магчымасьць намеціць дарожную сетку рэспублікі, адпавядаючую запатрабаваньням і інтарэсам народнай гаспадаркі і абароназдольнасьці краіны, — цесна ўвязаную з разьмяшчэньнем сацыялістычных вытворчых сіл, зьяўляючыся разам з тым найбольш эфэктыўнай з пункту гледжаньня інтарэсаў усёй народнай гаспадаркі ў цэлым.

Работнікам Галоўдартрансу, выпукацелям, прыдзецца сабраць і апрацаваць вялізарную колькасьць эканамічна-статыстычнага матар'ялу па ўсіх галінах народнай гаспадаркі, характарызуючага як сучаснае яе становішча, так і пэрспэктывы да канца 2-й пяцігодкі; выявіць транспартныя сувязі і высьветліць разьмеры груза-пасажыра-абаротаў у межах паасобных раёнаў і грузанапружанасьці дарожнай сеці БССР; скласьці карту сацыялістычнага разьмяшчэньня вытворчых сіл па рэспубліцы ў разрэзе паасобных раёнаў і інш.

Бел. МБІТ, ГарМБІТ, НІТО аўта-дартранспарту, РБ ІТР саюзу Чыгунаспортбуду, Арбюро ВБС НІТО ЦС Аўтадору зварочваецца да ўсіх бюро ІТС і ўсёй інжынэрна-тэхнічнай грамадзкасьці з просьбай аказваць усямерную дапамогу і садзейнічаньне работнікам ГТД у зборы неабходнага для правядзеньня паказанай работы матар'ялаў. Неабходна, каб гэта пытаньне было абгаворана на бюро ІТР з прыняцьцем канкрэтных мерапрыемстваў па аказаньню садзейнічаньня і дапамогі, з вылучэньнем адказных за гэта таварышоў, на якіх лавіна быць ускладзена. Устанаўленьне сувязі з бюро ІТС ГДТ, пры якім утвэран штаб садзейнічаньня.

Бел. МБІТ **Даўбор.**
Гар. МБІТ **Шчэглоў.**
ЦС Аўтадору **Акінчыц.**
РВ ІТС Чыгуноспорту **Гохфэльд**
Бел. НІТО - аўта-мото-транспарту і дарагаспадаркі Арбюро ВБС НІТО **Вонюкоў.**

ДАДАТАК: Пералік асноўных пытаньняў па якім будуць падрыхтоўвацца і выбірацца матар'ялы:

1. Геаграфічнае месцапалажэньне грузаўтварваючай точкі як існуючай, так і намечанай па пэрспэктыўнаму плану (завод, фабрыка, саўгас, МТС і г. д.).

Па кожнай кропцы (на 1932, 1933—1937).

2. Завоз паліва (ў вагавым выражэньні) з паказаньнем, а якіх раёнаў і пунктаў.

3. Завоз сырцу (ў вагавых выражэньні) з паказаньнем, з якіх раёнаў і пунктаў.

4. Вываз гатовай прадукцыі і паўфабрыкатаў з паказаньнем пунктаў накіраваньня (пункт далейшай перапрацоўкі, чыгуначная станцыя, прыстань, горад).

5. Далейшае накіраваньне гатовай прадукцыі (ад чыг. станцыі, прыстані, пункту далейшай перапрацоўкі).

6. Шляхі транспартаваньня паліва, сырцу, прадукцыі — з паказаньнем аўта-гужавых дарог, якімі карыстаецца даная грузаўтвараючая точка (назва дарог і іх працяг).

7. Наяўнасьць транспартных сродкаў (аўта-гуж-транспарт).

8. Разьмер унутрыгаспадарчых перавозак (у вагавым выражэньні).

9. Разьмер будаўніцтва па ўсіх відах.

10. Патрэбнасьць і завоз будматар'ялаў для новага будаўніцтва (новабудоўлі) і для рамонту і папаўненьня існуючага.

11. Завоз абсталяваньня як для новага будаўніцтва, так і для рэканструіруемых існуючых прадпрыемстваў.

12. Колькасьць рабочых з паказаньнем адлегласьці месцажыхарства іх ад месца працы.

Паведамленьні

— Менгарком КП(б)Б паведамляе, што прызначаны на 13-VIII-1933 г. агульнагарадзкі сход партактыву, прысьвечаны 30-годзьдзю другога зьезду партыі, пераносіцца на 15 жніўня г. г., 7 гадз. увеч. у летнім тэатры (сад «Прафінтэрн»).

Уязныя білеты на партактыў на 13-VIII сапраўдныя і на 15-VIII г. г.

Сакратары ячэек і парткалектываў, якія не атрымалі білетаў на партактыў, павінны атрымаць 14-VIII і 15-VIII у ГК КП(б)Б, пакой № 46, з 10 да 4 гадзін дня.

Менгарком КП(б)Б.

— Менгарком КП(б)Б паведамляе, што сёньня, 14 жніўня, роўна а 7-й гадзіне увечары ў памяшканьні дому Камасьветы (уваход з вул. Энгельса) адбудзецца нарада агітмасаў і ваенаргаў партыйных калектываў і ячэек на пытаньні правядзеньня ўсесаюзнага дня авіяцыі.

Яўка сваячасова і без спазьненьня.

Менгарком КП(б)Б.

— **15 жніўня,** у 7 гадз. веч. у памяшканьні ЦК КП(б)Б (4 паверху) адбудзецца **нарада камуністаў і камсамольцаў**—работнікаў цэнтральных газэт па пытаньні ходу ўборачнай кампаніі і хлебаздачы.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ — ВУЧПЭДСЭКТАР

ВЫШЛІ з ДРУКУ — на 13-е жніўня 1933 г.

ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ.

СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ на 1933/34 нав. год.

ДЛЯ ПАЧАТКОВАЙ і СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ

ЗАЦЬВЕРДЖАНЫЯ КАЛЕГІЯЙ НКА

Падручнікі для пачатковай школы (I канц.)

СІЎКО Н. Лемантар. (Выд. 1). Стар. 80, тыр. 140.000.—1933 г. ц. 50 к., пераплёт 30 к.

ТУПЯНЕВІЧ Ю. і А. Чытанка. (1 год навучаньня). Стар. 84, тыр. 130.000. — 1933 г. ц. 50 к., пераплёт 30 к.

ЯКІМОВІЧ А. і ГАРОДКІНА Е. Чытанка (II год навучаньня). Стар. 144, тыр. 140.000.—1933 г. ц. 1 руб., пераплёт 30 кап.

НЕКРАШЭВІЧ Ал. Хрэстаматыя па літаратуры, ч. 1. (III год навучаньня) Стар. 96, тыр. 50.000—1933 г., ц. 70 к., пераплёт 30 к.

КАРКАДИНОВСКАЯ Н. и РЫЖИКОВА З. Хрестоматия по русской литературе для IV года обучения. Стар. 54, тыр. 25.000, 1933 г., ц. 50 к., пераплёт 30 коп.

ПАПОВА Н. С. Падручнік арытмэтыкі для пачатковай школы, ч. 1. (I год навучаньня). Стар. 34, тыр. 65.000 — 1933 г. ц. 40 к., пераплёт 30 к.

ПАПОВА Н. С. Падручнік арытмэтыкі для пачатковай школы, ч. II (II год навучаньня) стар., 72, тыр. 40.000 — 1933 г. ц. 60 к., пераплёт—25 к.

ПАПОВА Н. С. Падручнік арытмэтыкі для пачатковай школы, ч. III. (III-IV гады навучаньня). Стар. 62, тыр. 80.000 —1933 г., ц. 40 к., пераплёт 30 к.

Падручнікі для сярэдняй школы (II-III канц.)

БЭНДЭ Л. Мастацкая літаратура. Хрэстаматыя для сярэдняй школы, ч. II. (VII год навучаньня). Сучасная літаратура. (Пад рэд. Бэндэ Л.). Стар. 328, тыр. 15.000—1933 г., ц. 3 р., пераплёт 30 к.

ПАПОЎ І. Арытмэтыка. Падручнік для сярэдняй школы. (V год навучаньня). Стар. 132, тыр. 40.000 — 1933г. ц. 1 р. 15 к., пераплёт—30 к.

БЕРАЗАНСКАЯ Е. С. Зборнік задач і практыкаваньняў па арытмэтыцы для сярэдняй школы. (V год навучаньня). Стар. 132, тыр. 40.000 — 1933 г. ц. 1 р., пераплёт 30 к.

КІСЯЛЁЎ А. Альгебра. Падручнік для сярэдняй школы, ч. 1. (VI-VII гады навучаньня). Стар. 128, тыр., 60.000 —1933 г., ц. 1 р. 20 к., пераплёт 30 к.

КІСЯЛЁЎ А. Альгебра. Падручнік для сярэдняй школы, ч. II. (VIII-IX гады навучаньня). Стар. 188, тыр. 12.000, 1933 г., ц. 1 р. 50 к., пераплёт 30 к.

ШАПАШНІКАЎ Н. А. і ВАЛЬЦАЎ Н. К. Зборнік альгебраічных задач для сярэдняй школы, ч. 1 (VI-VII гады навучаньня). Стар. 124, тыр. 80.000, 1933 г., ц. 95 к., пераплёт 30 к.

ШАПАШНІКАЎ Н. А. і ВАЛЬЦАЎ Н. К. Зборнік альгебраічных задач для сярэдняй школы, ч. II. (VIII-IX гады навучаньня). Стар. 124, тыр. 10.000, 1933 г., ц. 85 к., пераплёт 30 к.

БРАДЗІС В. Чатырохзначныя матэматычныя табліцы для сярэдняй школы. Стар. 46, тыр. 10.000, 1933 г., ц. 50 к., пераплёт 25 к.

ГУРВІЦ Ю. О. і ГАНГНУС Р. В. Пачатковыя зведы па геамэтрыі. Падручнік для сярэдняй школы. (V год навучаньня). Стар. 58, тыр. 45.000, 1933 г., ц. 55 к., пераплёт 30 к.

ГУРВІЦ Ю. О. і ГАНГНУС Р. В. Сыстематычны курс геамэтрыі. Падручнік для сярэдняй школы, ч. 1. (VI-VIII гады навучаньня). Стар. 180, тыр. 45.000, 1933 г., ц. 1 р. 30 к., пераплёт 30 к.

ГУРВІЦ Ю. О. і ГАНГНУС Р. В. Сыстематычны курс геамэтрыі. Падручнік для сярэдняй школы, ч. II (VIII-IX гады навучаньня). Тыр. 10.000.

ПАПОВА Н. С. Зборнік арытмэтычных задач і практыкаваньняў для пачатковай школы, ч. I. (III год навучаньня). Стар. 52, тыр. 35.000—1933 г. ц. 35 к., пераплёт 30 к.

ПАПОВА Н. С. Зборнік арытмэтычных задач і практыкаваньняў для пачатковай школы, ч. II. (IV год навучаньня). Стар. 66, тыр. 60.000—1933 г., ц. 40 к., пераплёт 30 к.

ЦЕЦЮРАЎ В. А. Прыродазнаўства. Падручнік для пачатковай школы, ч. 1 (III год навучаньня). Стар. 100, тыр. 55.000—1933 г., ц. 55 к., пераплёт—30 к.

ЦЭРАХАВА Л. Г. і ЭРДЭЛІ В. Г. Геаграфія. Падручнік для пачатковай школы, ч. I. (III год навучаньня). Стар. 86., тыр. 50.000, 1933 г., ц. 1 р., пераплёт 30 к.

ЦЭРАХАВА Л. Г. і ЭРДЭЛІ В. Г. Геаграфія. Падручнік для пачатковай школы ч. II. (IV год навучаньня). Стар. 134, тыр. 50.000, 1933 г., ц. 1 р. 30 к., пераплёт 30 к.

ГАДАШЭВІЧ. Грамадазнаўства. Падручнік для пачатковай школы, ч. III год навучаньня), стар. 130, тыр. 40.000—1933 г., ц. 90 к., пераплёт 30 к.

ВЯРХОЎСКІ В. Н. (праф.). Хімія. Падручнік для сярэдняй школы, ч. II. (VII год навучаньня). Стар. 136, тыр. 30.000, 1933 г., ц. 1 р. 20 к., пераплёт 30 к.

ВЯРХОЎСКІ В. Н. (праф.). Хімія. Падручнік для сярэдняй школы, ч. III. (VIII год навучаньня). Стар. 144, тыр. 10.000, ц. 1 р. 20 к., пераплёт 30 к.

НІКОЛЬСКІ Н. М. (акадэмік). Гісторыя дакласавае грамадзтва. Старажытны Усход. Антычны сьвет. Стар. 200, тыр. 50.000, 1933 г., ц. 2 р.

СІНІЦКІ Л. Д. Фізычная геаграфія. Падручнік для сярэдняй школы. (V год навучаньня). Стар. 154, тыр. 40.000, 1933 г., ц. 2 р., пераплёт 30 к.

ВАРЖАНСКІ С. і СІНІЦКІ Л. Геаграфія капіталістычных краін. Падручнік для сярэдняй школы. (VI год навучаньня). Стар. 164, тыр. 30.000, 1933 г. ц. 1 р. 60 к., пераплёт 30 к.

БАРАНСКІ. Эканамічная геаграфія, ч. II. Падручнік для сярэдняй школы. (VIII-IX гады навучаньня). Стар. , тыр. 10.000, 1933 г., ц. 2 р. 20 к., пераплёт 30 к.

УСЕСЬВЯЦКІ Б. В. Батаніка. Падручнік для сярэдняй школы. (V-VI гады навучаньня). Стар. 160, тыр. 50.000, 1933 г., ц. 1 р. 20 к., пераплёт 30 к.

КАБАНАЎ А. Н. Анатомія і фізыялёгія чалавека. Падручнік для сярэдняй школы. (VIII год навучаньня). Стар. 192, тыр. 7.000, 1933 г., ц. 1 р. 75 к., пераплёт 75 к. (у калёнкору).

БЕЛЯЕЎ М. М. Асновы эвалюцыйнага вучэньня. Падручнік для сярэдняй школы. (IX год навучаньня). Стар. 156, тыр. 10.000, 1933 г., ц. 2 р., пераплёт 30 к.

Падручнікі для школ нацменшасьцяй

НА ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ:

БАРОН і КУЛЬБАК. Чытанка для (VIII-IX гады навучаньня). Стар. ... II году навучаньня. Стар. 144, тыр. 12.000, 1933 г., ц. 1 р., пераплёт 30 к.

РАВІН І. і ЩАЦ В. Літаратура. Падручнік для IV году навучаньня. Стар. 176, тыр. 30.000, 1933 г., ц. 1 р. 50 к., пераплёт 30 к.

ПАПОЎ І. Арытмэтыка. Падручнік для сярэдняй школы. (V год навучаньня). Стар. 156, тыр. 18.000, 1933 г., ц. 1 р. 15 к., пераплёт 30 к.

БЕРАЗАНСКАЯ Е. С. Зборнік задач і практыкаваньняў для сярэдняй школы. (V год навучаньня). Стар. 134, тыр. 18.000, 1933 г., ц. 1 р., пераплёт 30 к.

КІСЯЛЁЎ А. Альгебра. Падручнік для сярэдняй школы ч. I. (VI-VII гады навучаньня). Стар. 140, тыр. 25.000, 1933 г., ц. 1 р. 20 к., пераплёт 30 к.

ШАПАШНІКАЎ Н. А. і ВАЛЬЦАЎ Н. К. Зборнік альгебраічных задач для сярэдняй школы, ч. 1 (VI-VII гады навучаньня). Стар. 134, тыр. 25.000, 1933 г., ц. 95 к., пераплёт 30 к.

ШАПАШНІКАЎ Н. А. і ВАЛЬЦАЎ Н. К. Зборнік альгебраічных задач для сярэдняй школы, ч. II. (VIII-IX гады навучаньня). Стар. ..., т. 5.000, 1933 г., ц. 1 р., пераплёт 30 к.

ФАЛЕЕЎ Г. І. і ПЕРЫШКІН А. В. Фізыка. Падручнік для сярэдняй школы, ч. I. (V год навучаньня). Стар. 98, тыр. 15.000, 1933 г., ц. 85 к., пераплёт 30 к.

ФАЛЕЕЎ Г. І. і ПЕРЫШКІН А. В Фізыка. Падручнік для сярэдняй школы, ч. II. (VI год навучаньня). Стар. 152, тыр. 15.000, 1933 г., ц. 1 р. 20 к., пераплёт 30 к.

ФАЛЕЕЎ Г. І. і ПЕРЫШКІН А. В Фізыка. Падручнік для сярэдняй школы, ч. III. (VII год навучаньня). Стар. 180, тыр. 15.000, 1933 г., ц. 1 р. 50 к., пераплёт 30 к.

ФАЛЕЕЎ Г. І. і ПЕРЫШКІН А. В Зборнік задач па фізыцы для сярэдняй школы. (V-VII гады навучаньня). Стар. 116, тыр. 40.000, 1933 г., ц. 70 к., пераплёт 30 к.

ВЯРХОЎСКІ В. Н. (праф.). Хімія. Падручнік для сярэдняй школы, ч. I (VI год навучаньня). Стар. 126, тыр 15.000, 1933 г., ц. 80 к., пераплёт 30 к

ВЯРХОЎСКІ В. Н. (праф.). Хімія. Падручнік для сярэдняй школы, ч. II (VII год навучаньня). Стар. 154, тыр 15.000, 1933 г., ц. 1 р. 20 к., пераплёт 30 к.

НА ПОЛЬСКАЙ МОВЕ:

КІСЯЛЁЎ А. Альгебра. Падручнік для сярэдняй школы, ч. I. (VI-VII гады навучаньня). Стар. 132, тыр. 10.000, 1933 г., ц. 1 р. 20 к., пераплёт 30 к.

ШАПАШНІКАЎ Н. А. і ВАЛЬЦАЎ Н. К. Зборнік альгебраічных задач для сярэдняй школы, ч. I. (VI-VII гады навучаньня). Стар. 126, тыр. 8.000, 1933 г., ц. 95 к., пераплёт 30 к.

ФАЛЕЕЎ Г. І. і ПЕРЫШКІН А. В. Фізыка. Падручнік для сярэдняй школы, ч. I. (V год навучаньня). Стар. 92, тыр. 9.000, 1933 г., ц. 85 к., пераплёт 30 к.

ФАЛЕЕЎ Г. І. і ПЕРЫШКІН А. В. Фізыка. Падручнік для сярэдняй школы, ч. II. (VI год навучаньня). Тыр. 8.000.

ФАЛЕЕЎ Г. І. і ПЕРЫШКІН А. В. Фізыка. Падручнік для сярэдняй школы, ч. III. (VII год навучаньня). Стар. 164, тыр. 6.000, ц. 1 р. 50 к., пераплёт 30 к.

ФАЛЕЕЎ Г. І. і ПЕРЫШКІН А. В. Зборнік задач па фізыцы для сярэдняй школы. (V-VII гады навучаньня). Тыр. 15.000.

ВЯРХОЎСКІ В. Н. (праф.). Хімія. Падручнік для сярэдняй школы, ч. I. (VI год навучаньня). Стар. 172, тыр. 8.000, 1933 г., ц. 80 к., пераплёт 30 к.

ВЯРХОЎСКІ В. Н. (праф.). Хімія. Падручнік для сярэдняй школы, ч. II (VII год навучаньня). Тыр. 6.000.

НА ЛІТОЎСКАЙ МОВЕ:

ПАПОВА Н. С. Падручнік арытмэтыкі для сярэдняй школы,